Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Центральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца з 5-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: Па 1 месяц . . . — 20 к. „ 3 „ . . . 2 р. — к. „ 6 „ . . . 4 р. — к. „ 1 год . . . 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. месцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нашпаралі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок нашпаралі наперад тэксту 1 р. — к. За радок нашпаралі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпецыяльна на 50 проц. дарожэй. Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. назогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумэнт . . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Бесспрэчны і чырвонаармэйцы за дакумэнт . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ЦАНА НУМАРУ 4 кап.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 18 (2205) Субота, 21-га студзеня 1928 г.

Сёньня з вялікім жалем успамінаюць процоўныя ва ўсіх куткох зямной кулі аб беззваротнай страце: два гады таму назад пакінуў масы ўлюбёны настаўнік і правадыр, які ўзьняў да новага жыцьця вялізарныя масы пралетарыяў, працоўных, прыгнечаных, які яднаў іх шэрагі адзінаю воляю, воляю да барацьбы, вялікаю воляю да будаўніцтва новага сьвету.

З самых цяжкіх боек вывеў ён нас, паказаў шлях і памёр на парозе адраджэньня нашай краіны, на парозе росту сацыялізму, за які ён змагаўся і за які ён аддаў усё сваё жыцьцё.

Сьмела працягвайце яго справу, таварышы! Разьбівайце ланцугі капіталізму! Будуйце новую сацыялістычную краіну!

БЯЗ ЛЕНІНА--ПАЛЕНІНСКУ.

Чатыры гады мінула, як рабочыя і сяляне ўсіх краін страцілі свайго правадыра—Леніна. Ленін быў інтэрнацыянальным правадыром, быў правадыром усіх рабочых і сялян, усіх прыгнечаных і зьняволеных народаў таму, што ён іх арганізоўваў, таму, што ён іх заклікаў, таму, што ён вёў іх да перамогі над ладам эксплёатацыі, рабаваньня, капіталізму, таму, што вёў іх да камунізму.

«Бяз Леніна—па ленінскаму шляху» зрабіўся лёзунгам, які ахапіў усю нашую краіну; гэты лёзунг моцна асеў у мазгох усіх партыйцаў, усіх рабочых і сялян, актыўна працуючых над справай будаўніцтва сацыялізму. «Бяз Леніна—па ленінскаму шляху»—зрабіўся лёзунгам камуністычных партый і ўсіх рэвалюцыйных рабочых і сялян Захаду і Ўсходу, актыўна змагаючыхся за вызваленьне ўсяго сьвету ад уціску капіталістаў і абшарнікаў. Імя Леніна зрабілася яшчэ больш дарагім для сотняў міліёнаў працоўных. Ліенінізм зрабіўся яшчэ больш яскравым сьветачам для сусьветнага рэвалюцыйнага руху.

4 гады мінула, як Ленін пакінуў нас і загадаў нам давесьці перамогу сацыялізму да канца. Ці выканалі мы яго загад? Ці вядзейсьнілі мы мары і заветы нашага правадыра і настаўніка?

Ленін загадаў нам берагчы першую рэспубліку працоўных у сьвеце—Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Гэты яго загад мы з гонарам выконваем. **Мы адстаялі і адстойваем СССР** ад нападу ўсякага роду імпэрыялістаў, якія імкнуцца прыдушыць Савецкі Саюз. Усямерна ўзмацняем СССР і павялічваем яго абароназдольнасьць. Працоўныя ўсяго СССР, як адзін, гатовы абараняць рэспубліку ад усякага роду ворагаў.

Ленін загадаў нам **трымаць шчыльны саюз з працоўнымі масамі ўсяго сьвету.** Дзесяцігадовы юбілей Кастрычнікавае Рэвалюцыі і тая ўвага, якая сусьветным пралетарыятам была зьвернута на гэтае сьвята, сьведчыць аб тым, што мы яшчэ больш узмацнілі сувязь з рабочымі і сялянамі Захаду і Ўсходу, што непарыўна наша справа з імі і што забясьпечана ўзаемная дапамога нашага пралетарыяту і пралетарыяту капіталістычных краін у выпадку патрэбы. Гэта было даказана ў часе ўсеагульнае забастоўкі гарнякоў у Англіі, у часе паўстаньня ў Вене і ў часе вялікае рэвалюцыі ў Кітаі. **Пралетарыят капіталістычных краін упэўнена ідзе да сваёй рэвалюцыі і пад ленінскім сьцягам ён пераможе.**

Партыя і савецкая ўлада цьвёрда выконваюць заветы Леніна аб разьвіцьці актыўнасьці рабочых і сялянскіх (бядняцкіх і серадняцкіх) мас, аб згуртаваньні іх навакол партыі, навакол саветаў, прафсаюзаў, каапэрацыі, аб уцягненьні іх у будаўніцтва сацыялізму ў горадзе і на вёсцы.

Будаваць сацыялізм, вучыў Ленін, могуць толькі міліёны, і досыць глянуць на чатырохгадовы шлях, пройдзены партыяй і савецкай уладай за час пасьля сьмерці Леніна, як пераканаемся, што мы пасьпяхова выконваем гэты ленінскі загад. За апошні час мы маем значнае **АЖЫЎЛЕНЬНЕ САВЕТАЎ**, павялічыўся ўдзел у іх працы шырокіх мас рабочых і сялян. Мы маем значны **РОСТ КААПЭРАЦЫІ** ў горадзе і на вёсцы. Растуць **АРГАНІЗАЦЫІ БЕДНАТЫ** навакол саветаў і каапэрацыі і згуртаваньне беднаты з сярэднім сялянствам проці кулака. Міліёны працоўных на справе, на практыцы, на сваім уласным вопыце вучацца ісьці па ленінскім шляху барацьбы і будаўніцтва. І на гэтай вучобе **новыя дзесяткі і сотні тысяч рыхтуюцца да таго, каб стаць у шэрагі перадавых барацьбітоў за камунізм—у шэрагі нашае бальшавіцкае партыі.** Гэтак было пры Леніне, гэта і застаецца зараз таму, што **кіраўніком барацьбы і будаўніцтва сацыялізму ў нашай краіне застаецца ленінская бальшавіцкая партыя.**

Ленін загадаў нам **БУДАВАЦЬ САЦЫЯЛІЗМ** у нашай краіне. Ён давёў, што мы маем усё магчымае і патрэбнае для пасьпяхоўнага будаўніцтва сацыялізму ў нашай рэспубліцы. Мы таксама выконваем і гэты загад Ільліча. Дзесяткі новых фабрык і заводаў, міліёны дзесяцін упарадкаванай сялянскай зямлі, сотні тысяч мэліараваных бажот, сотні тысяч новых рабочых, уцягнутых у прамысловасьць,—усё гэта разам узятае даводзіць аб тым, што **мы з гонарам выконваем загад Ільліча аб пабудове сацыялізму. І яшчэ адно—мы будуем сацыялізм ня толькі рукамі 1½ міліёну камуністаў, але і рукамі дзесяткаў міліёнаў рабочых і сялян у горадзе, вясковай беднаты і перадавых пластоў серадняцкага сялянства на вёсцы.**

Мы канкрэтна распачалі **АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ЛЕНІНСКАГА КААПЭРАЦЫЙНАГА ПЛЯНУ І КУЛЬТУРНАЕ РЭВАЛЮЦЫІ.** Апошнія перавыбары каапэрацыі даказваюць нам, што каапэрацыя выконвае абавязкі, ускладзеныя на яе Ўладзімірам Ільлічом і што нашая партыя забясьпечыла за каапэрацыяй належнае месца і ўвагу, якія даюць ёй магчымасьць весьці вёску наперад да сацыялізму. Мы канкрэтна ўступілі ў пэрыяд культурнае рэвалюцыі. Дзесяткі і сотні міліёнаў рублёў адпускаюцца дзяржаваю на ўзьнятьцьце культурнага ўзроўню шырокіх працоўных мас нашае рэспублікі.

Гэта дае нам права ў чацьвёртую гадавіну сьмерці нашага правадыра сказаць:

БЯЗ ЛЕНІНА—ПА ЛЕНІНСКАМУ ШЛЯХУ НАШАЯ ПАРТЫЯ ІДЗЕ АДНАЧАСОВА НА ЧАЛЕ РАБОЧЫХ І СЯЛЯНСКІХ МАС ДА БУДАЎНІЦТВА САЦЫЯЛІЗМУ І Ў АВАНГАРДЗЕ СУСЬВЕТНАГА КАМУНІСТЫЧНАГА РУХУ, УСЮДЫ НЯСУЧЫ Ў СВАІХ РУКАХ СЬЦЯГ ЛЕНІНІЗМУ.

Веліч гэнія.

Веліч гэнія робіцца зразумелым на адлегласьці, галоўным чынам тады, калі нас аддзяляе ад яго нейкі пэрыяд часу.

Прагледзьце гісторыю людзей, прызнаных вялікімі, і наўрад ці знойдзеце хоць аднаго, хто атрымаў прызнаньне, якое ўвайшло-б у гісторыю пры жыцьці.

У гісторыі гэніяльных правадыроў і мысьлеьнікаў Ленін зьяўляецца бясспрэчным выключэньнем. Ленін—гэніяльны правадыр працоўных і прыгнечаных, гэніяльны натхніцель і стратэг пралетарскай рэвалюцыі—гэткім яго ўяўлялі ня толькі працоўныя гушчы, якіх ён вёў да зьнішчэньня улады капіталу, гэткім яго ўяўлялі нават клясавыя ворагі.

Калі вымаўляеш, калі чытаеш—Ленін,—ва ўяўленьні выплывае першна-перш ня фізычны вобраз правадыра, а вобраз яго вялікіх думак і яго арганізатарскага гэкія. **Партыя. Кастрычнікавая рэвалюцыя. Камінтэрн.** Вось чым зьяўляўся **Ленін.**

Надыходзячая сусьветная пралетарская рэвалюцыя. Надыходзячае радыкальнае аднаўленьне чалавецтва—«скачок з царства неабходнасьці ў царства волі» (Ф. Энгельс)—вось чым зьяўляўся **Ленін.**

«Ленін памёр, але Ленін жывы»,—пісалі ў дні вялікай жалобы. У гэтых словах гучэла праўда. Застыў гэніяльны, творчы мозг. Але партыі, пралетарыяту засталася такая вялізарная спадчына ленінскіх думак, ленінскіх дзеляў—**ленінізм**,—што ўладаючы гэтай спадчынай партыя, Камінтэрн, пралетарыят—бясспрэчна з посьпехам выканаюць сваю гістарычную місію.

Заветы Леніна—гэта не закамянелыя формулы, гэта жывыя дырэктывы да сённяшняга і заўтрашняга дню, гэта невычарпальныя рэвалюцыйна-пралетарскія думкі, жыватворчая невычарпальная крыніца, бязупынна аднаўляючая духам вялікай творчасьці штодзённую працу партыі, штодзённую пралетарскую барацьбу.

Змагацца супроць нашай партыі ў пралетарскіх шэрагах цяпер немагчыма, адхіляючы сьцяг ленінізму. Таму і тыя, што хочуць замяніць гэты сьцяг іншым, прымушаны прызнаць карэнную зьмену ўсяго нашага пункту погляду на сацыялізм. Гэта карэнная зьмена складаецца з таго, што раней мы ўсю ўвагу аддавалі і павінны былі аддаваць на палітычную барацьбу, рэвалюцыю, заваёву ўлады і г. д. Зараз жа асяродак увагі зьмяняецца да таго, што перанесіцца на мірную арганізацыйную «культурную» працу. Я гатоў казаць, што асяродак увагі для нас пераносіцца на культурніцтва, калі-б не міжнародныя адносіны, не абавязак змагацца за нашу пазіцыю ў міжнародным маштабе. Але калі адсунуць гэта ў бок і абмежавацца ўнутранымі эканамічнымі адносінамі, дык у нас сапраўды зараз увесь асяродак увагі накіраван на культурніцтва.» (Ленін т. XVIII).

Ленін даказаў, што ў нашых умовах просты рост каапэрацыі раўналежны росту сацыялізму, бо пры дзяржаўнай уласнасьці на ўсю вытворчасьць і сродкі вытворчасьці ў гарадох пам застаецца *„толькі“* каапэраваць, калектывізаваць вясковую гаспадарку, яе вытворчасьць і закончыць каапэраваньне спажываньня ў горадзе і вёсцы. Каапэрацыя, такім чынам, у савецкіх умовах цалком адрозьніваецца ад яе стану ў капіталістычных умовах, бо яна тут выкарыстоўваецца не для наживы, не для збыту капіталістычнай, эксплёататарскай прамысловасьці, а для здавальненьня запатрабаваньняў шырокіх працоўных мас насельніцтва, для таго, каб вырваць працоўныя масы з-пад эксплёатацыі прыватніка-спэкулянта.

Галоўнай перашкодай на шляху нашага тэхнічнага прагрэсу і нагалоўнага каапэраваньня—гэта наша некультурнасьць, тэхнічная адсталасьць, няпісьменнасьць значнага ліку нашага насельніцтва. Для таго, каб зрабіцца зусім сацыялістычнай краінай, нам не хапае

«толькі» аднаго: зрабіць нашае насельніцтва настолькі „цывілізаваным“, каб яно зразумела ўсе выгады ад пагалоўнага ўдзелу ў каапэрацыі і наладзіла гэты ўдзел. „Толькі“ гэта. Нічога іншага мудрага нам ня трэба цяпер для таго, каб перайсьці да сацыялізму. Але для таго, каб зрабіць гэта «толькі», патрэбны цэлы пераварот, цэлая паласа культурнага разьвіцьця ўсёй народнай масы». (Ленін т. XVIII).

Вось гэтага «толькі» нам не хапае. Ленін падкрэсьлівае, што гэта справа не аднаго дню, а аднаго-двух дзесяткаў гадоў, але зараз мы ўжо ўступілі ў гэткую паласу сацыялістычнага будаўніцтва, калі культурная рэвалюцыя робіцца штодзённай нашай справай, калі на пытаньні культурнага будаўніцтва, культурнага ўздыму мас, будаўніцтва нацыянальнае культуры мы павінны будзем зьвяртаць больш увагі, чым зьвярталі раней. Зусім зразумела, што бяз гэтага культурнага ўздыму мы ня здолеем узьняць нашу вытворчасьць, павялічыць таварнасьць сельскай гаспадаркі, электрыфікаваць і каапэраваць краіну і пасьпешна змагацца з бюракратызмам. Хіба ня факт, што бюракратызм зьяўляецца адным з галоўных ворагаў нашага пасьпешнага будаўніцтва? А хіба ня факт, што калі-б мы былі больш культурнымі, мы-б куды лягчэй перамаглі гэты бюракратызм? Задачы, якія т. Ленін вызначыў у сваіх апошніх артыкулах і высунутых XV партзьездам, як чарговыя задачы, ня могуць быць пасьпешна выкананы без актыўнага ўцягненьня рабочых і сялянскіх мас у кіраўніцтва краінай. Да таго, як рабочая клясa ўзяла ўладу ў свае рукі, мы кожны недахоп буржуазнага апарату ўзьнімалі на прыцыповае ўзвышша, заклікалі ламаць і ўзрываць яго. Зараз трэба ня ўзрываць апарат, а зьнішчаць і выпраўляць тыя недахопы, якія мы заўважаем у нашым апараце. Ясна, што ламаць куды лягчэй, чым выпраўляць. **Таму мы зараз і высоўваем задачы культурнай рэвалюцыі, каб вучыцца кіраваць, выпраўляць, менш дапушчаць памылак у нашым будаўніцтве.**

Што такое культурная рэвалюцыя, што значыць узьняць культурны ўзровень мас? Мы, на вялікі жаль, звычайна гэтымі тэрмінамі апярыруем, гаворым аб культуры і інш., але што яны азначаюць, што трэба зрабіць, каб стаць культурнымі,—вельмі мала зазначаем.

Для таго, каб стаць «цывілізаванымі», культурнымі, Ленін ў першую чаргу высоўвае элемэнтарную пісьменнасьць. Дзесяткі міліёнаў нашага насельніцтва застаюцца яшчэ дагэтуль няпісьменнымі, а гэта зьяўляецца асноўнай перашкодай на шляху сацыялістычнага буйаўніцтва. Таму Ленін даў нам наказ паставіць справу ліквідацыі няпісьменнасьці, як баявую задачу.

Мала зьнішчаць элемэнтарную няпісьменнасьць, нам трэба ўзьнімаць культурны ўзровень тых, хто навучыўся пісьменнасьці: вячэрнія школы, школы для дарослых, клюбныя гурткі, гурткі самаадукацыі—усе яны павінны ахапіць сотні тысяч рабочых і сялян, каб зрабіць іх сьвядомымі грамадзянамі і будаўнікамі сацыялізму. Толькі сьвядомы рабочы і селянін змогуць зьнішчаць перашкоды, бязупынна будаваць, дамагацца перамогі. Нашы школы, клюбы, нардамы, хаты-чытальні павінны нам гэтых сьвядомых барацьбітоў даць.

Прагулы на фабрыках і прадпрыёмствах, спынеьне машын п'янымі машыністамі, псаваньне варстатаў і дзесяткі падобных прыкладаў,—хіба яны не зьяўляюцца вынікамі нашае некультурнасьці? Ці зьвярталі мы досыць увагі на тое, што прадукцыйнасьць працы рабочых замежамі ў 4-5 разоў больш за нашых рабочых? Ці не зьяўляецца гэта вынікам нашай тэхнічнай няпісьменнасьці?

Зусім зразумела, што культурнасьць не абмяжоўваецца аднэй пісьменнасьцю. Агульная пісьменнасьць—гэта толькі першы крок да культурнасьці, але крок нагэтулькі важны, без якога немагчым ніякі культурны ўздым, ніякі культурны рост. Толькі пісьменны чалавек навучыцца карыстацца кнігай, газэтай, тэатрам, клюбам, кіно і г. д.

Быць культурным, гэта значыць быць пісьменным, добра ведаць абкружаючыя абставіны, умець у іх разабрацца, ведаць, што ад яго патрабуецца і як што трэба зрабіць—трэба быць адукаваным.

Наша задача ў тым, каб менш весьці агульныя гутаркі аб культурнай рэвалюцыі і культурнасьці, а больш штодзённай практычнай працы на цывілізацыі і адукацыі мас, па вызваленьні іх ад цёмры, няпісьменнасьці і некультурнасьці. Бяз гэтага мы да сацыялізму ня дойдзем, ня гледзячы на тое, што мы маем палітычную ўладу ў сваіх руках. Будзем памятаць гэты асноўны завет Ільліча.

Л. К.

ЛЕНІН І КУЛЬТУРНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ.

НЕАГАЛОШАНЫ РУКАПІС УЛ. І. ЛЕНІНА.

(Ад Інстытуту імя Леніна).

У архіве Інстытуту Леніна ў Маскве ёсьць рукапіс Ул. І. Леніна аб вайне, які, калі судзіць па першым сказе, напісаны Ўладзімірам Ільлічом у жніўні 1915 г. Водаўг ўсіх даных, адозва прызначалася для лістоўкі-праклямацыі ЦК РСДРП(б), якая выдавалася рэдакцыяй «Сацыял-Дэмакрата» ў часе вайны. Дакумант напісаны на 3-х паўлісткох чорным атраментам уборыстым почаркам з невялікімі выпраўленьнямі ў тэксьце.

Адозва тав. Леніна аб вайне.

Таварышы рабочыя! Вось ужо больш году цягнецца эўрапейская вайна. Мірнуючы па ўсім, яна працягнецца яшчэ вельмі доўга, бо калі Нямеччына найлепш падрыхтавана і мацнейшая, дык затое саюз 4-х дзяржаў (Расеі, Англіі, Францыі і Італіі) мае грошы, а апрача таго, волька атрымлівае ваенныя прыпасы з самага багатага краю сьвету—Злучаных Штатаў Амэрыкі.

З-за чаго-ж ідзе вайна, якая прыносіць чалавецтву нязьлічоныя беды і пакуты? Урад і буржуазея кожнага ваюючага краю выкідаюць міліёны рублёў на кніжкі і газэты, абвінавачваюць ва ўсім праціўніка, узбуджаючы ў народзе шалёную нянавісьць да ворага, ня спыняючыся нават перад маною, каб паказаць сябе дзяржаваю, якая «бароніцца», якая падпала несправядлівашу нападу. А сапраўды-ж, гэта ёсьць вайна між дзьвюма групамі разбойніцкіх дзяржаў з-за падзелу калёній, з-за прыгнечаньня іншых нацый, з-за выгад і прывілеяў на сусьветным рынку. Гэта самая рэакцыйная вайна, вайна сучасных прыгнятальнікаў за захаваньне і ўмацаваньне капіталістычнага нагнавольніцтва. Англія і Францыя маняць, запэўніваючы, што вядуць вайну за волю Індыі. На справе яны даўно рыхтавалі вайну і вядуць яе для абрабаваньня Нямеччыны, пазбаўленьня яе калёній, яны падпісалі ўгавор з Італіяй і Расеяй аб абрабаваньні і падзеле Турцыі і Аўстрыі. Царская манархія ў Расеі вядзе рабаўнічую вайну, імкнучыся захапіць Галіцыю, адняць землі ў Турцыі, падпаволіць Турцыю, Манголію і г. д. Нямеччына вядзе вайну за рабунак калёній Англіі, Індыі, Францыі. Ці пераможе Нямеччына, ці Расея, ці вайна скончыцца ў „нічыю“—у кожным выпадку, вайна прынясе чалавецтву новае прыгнечаньне сотняў і сотняў міліёнаў жыхарства ў калёніях, Бэльгіі, Турцыі, Кітаю, новае прыгнечаньне нацый, новыя катаваньні для рабочае клясы ўсіх краёў.

Якія-ж задачы стаяць перад рабочаю клясаю ў адносінах да гэтае вайны? На гэтае пытаньне ўжо быў дадзены адказ у адназгодна ўхваленай сацыялістамі ўсяго сьвету рэзалюцыі Базынскага міжнароднага сацыялістычнага кангрэсу 1912 году. Гэтая рэзалюцыя была ўхвалена ў прадбачаньні ўласна такое вайны, якая ў 1914 годзе і распачалася. У гэтай рэзалюцыі гаворыцца, што вайна рэакцыйная, што яна рыхтуецца ў інтарэсах „прыбытку капіталістаў“, што рабочыя лічаць „злачынствам страляць адзін у другога“, што вайна павядзе да „пралетарскае рэвалюцыі“, што ўзорам тактыкі для рабочых зьяўляецца Парыская Камуна 1871 году і кастрычнік-сьнежань 1905 году ў Расеі, г. зн. рэвалюцыя.

Усе сьвядомыя рабочыя Расеі стаяць на баку расейскае сацыял-дэмакратычнае рабочае партыі ў Дзяржаўнай Думе (Патроўскага, Бадаева, Муранава, Самойлава і Шагава), якія высланы царызмам у Сібір за рэвалюцыйную прапаганду проці вайны і проці ўраду. Толькі ў гэтай рэвалюцыйнай прапагандзе і рэвалюцыйнай дзейнасьці, якая вядзе да абурэньня мас, ратунак чалавецтва ад жахаў сучаснае вайны і будучых войнаў. Толькі рэвалюцыйнае знасаваньне буржуазных урадаў, і ў першую чаргу самага рэакцыйнага, дзікага і барбарскага царскага ўраду адчыніць шлях народу да сацыялізму і міру між народамі. І маняць тыя сьвядомыя і несьвядомыя коли буржуазеі, якія запэўняюць народ, што рэвалюцыйнае знасаваньне царскае манархіі можа прывесьці толькі да перамог і ўзмацненьня нямецкае рэакцыйнае манархіі і нямецкае буржуазеі. Хоць кіраўнікі нямецкіх сацыялістаў, як і шмат якія іншыя выдатныя сацыялісты Расеі, перайшлі на бок „сваёй“ буржуазеі і дапамагаюць ашукваць народ байкамі аб „абарончай вайне“, гле ў рабочых масах Нямеччыны расьце і мацнее пратэст і абурэньне проці свайго ўраду. Сацыялісты Нямеччыны, якія не перайшлі на бок буржуазеі, абвяшчаі ў друку, што лічаць „гэройскаю“ тактыку расейскае сацыял-дэмакратычнае рабочае фракцыі. У Нямеччыне выдзюцца нелегальна адозвы проці вайны і проці ўраду. Дзесяткі і сотні лепшых сацыялістаў Нямеччыны, у тым ліку і бедная прадстаўніца жаночага рабочага руху Клара Цэткін, кінуты нямецкім урадам у астрог за прапаганду рэвалюцыйным духу. Ва ўсіх без выняткова ваюючых краёх р сьце абурэньне, і прыклад рэвалюцыйнае дзейнасьці сацыял-дэмакратычнае Расеі, а тым больш усякі посьпех рэвалюцыі ў Расеі, намінуча пасуне наперад вялікую справу сацыялізму, перамогі пралетарыяту над эксплёататарскай і крывавай буржуазеяй.

Вайна напаўняе кішэні капіталістаў, да якіх цячэ мора золата з такіх вялікіх дзяржаў. Вайна вялікае сьляпое абурэньне проці ворага, і буржуазея ўсімі сродкамі накіроўвае ў гэты бок нездаволе ьне народу, адцягваючы яго ўвагу ад галоўнага ворага: ураду і камандуючых клясаў свайго краю.

Але вайна, прыносячы нязьлічаныя бедствы працоўным масам, разам з тым гартоўвае лепшых прадстаўнікоў рабочае клясы. Калі гінуць, дык лепш загінем за справу рабочых, за сацыялістычную рэвалюцыю, а не за інтарэсы капіталістаў, абшарнікаў і цароў—вось што бачыць і адчувае кожны сьвядомы рабочы. І, як ні цяжка цяпер рэвалюцыйная сацыял-дэмакратычная праца, яна магчыма, яна ідзе наперад ва ўсім сьвеце, у ёй адной ратунак.

Прэч царскую манархію, уцягнуўшую Расею ў злачынную вайну і прыгнятаючую народы.

Нахай жыве ўсясьветнае братэрства рабочых і міжнародная рэвалюцыя пралетарыяту.

Вёска на сьмерць Леніна.

На сьмерць Леніна сялянства адгукнулася з вялікім пачуцьцём, асабліва беднота, якая наладзіла Леніну сапраўдны жаль. У час сьмерці Леніна мне прышлося быць у вёсцы на Магілеўшчыне і мець магчымасьць назіраць настрой сялянства. Помню, гэта было раніцой. Нехта прыехаў з воласьці і паведаміў, што памёр Ленін. Сялянам няма веры, пачалі яны з хаты ў хату бегаць, каб сапраўдней даведацца. На сустрэчу мне, па вуліцы, ідзе селянін-бядняк па ваду.

— Здрасьце, мусіць няладна: з пустым сустрэў.

— Ня толькі няладна, а зусім кепска: Ленін памёр...

— Ленін... Памёр Ленін...

У селяніна пацямнела ў вачох, зірнуў ён уніз і ўпусьціў з рук вёдры.

* * *

З канцоў вёскі на сярэдзіну кучкамі сходзіліся сяляне да камсамольца Юркі. Найшло людзей поўная хата, курань, гамоняць і ўсё адзін у другога пытаецць аб Леніне: ці праўда, што ён памёр.

— Камсамольцы ідуць,—убачылі сяляне ў вакно,—вось цяпер напэўна ведаць будзем.

Але не ўцярпелі, пакуль камсамольцы зойдуць у хату, выбегла грамада сялян на вуліцу. Людзей многа, усім адразу нельга запытаць, пачалі адзін другога таўхаць, каб хутчэй дастуціцца да камсамольцаў.

— Што цяпер рабіць будзем? Хто будзе кіраваць дзяржавай?—падумаўшы, сказаў адзін селянін.

— Цэлы будзем,—сказаў другі селянін, дэмабілізаваны чырвонаармеец,—кіраваць дзяржавай ёсьць каму і ведаюць як, бо Ленін паўчыў, і вось калі пойдзем па яго вучэньню, дык, вядома, цэлы будзем.

Вялікі жаль апрануў вёску.

* * *

К поўдню амаль каля кожнае хаты пад страхой тарчэлі жалобныя сьцягі. Павесілі іх, як хто сумеў: адзін павесіў кавалак чорнага халсту, другі—хустку, трэці—адрэзаную калашыну ад штаноў чорных і г. д. Кожны што меў, тое і павесіў, каб гэтым самым паказаць свой жаль з прычыны сьмерці Леніна.

* * *

На другі дзень шмат сялян накіравалася ў горад, каб прымаць там удзел у хаўтурнай дэманстрацыі. Вечарам к тым, хто езьдзіў у горад, пачалі зьбірацца сяляне: іх цікавіла, што там было.

Пачалася гутарка аб жыцьці Леніна і што ён зрабіў для вызваленьня працоўных ад уціску буржуазеі.

— Вечная яму слава і пакой,—сказаў,—сядзеўшы на печы 80 год дзед, гэта праз яго, Леніна, мы атрымалі зямлю і свабоду. Добра, што мне застаецца мала жыць, хутчэй на «тым сьвеце» з Леніным убачыцца.

Гутарылі сяляне да самай поўначы, і толькі пасьля другіх поўнаў пачалі расходзіцца, між сабой гаворачы: «Ленін памёр, няма Леніна».

Я. Збуржынскі

ВЕСКА НА ЛЕНІНСКІМ ШЛЯХУ.

Пад сьцягам Леніна наша вёска няўпынна ідзе да сацыялізму.

На новай зямлі.

На топкім балоце--нябывалыя ўраджаі.

На балоце ў Зубараўскім пасёлку яшчэ летась тапілася і гінула жывёла. Назалетась Зубараўскі пасёлак, арганізаваўшыся ў мэліарацыйнае таварыства, распачаў працу па асушцы балота, і к восені 1926 году значная плошча была ўзорана. Мінулай вясной 9 дзесяцін былі ўжо засеяны розными палявымі і гароднімі расьлінамі: вікай з аўсом, аўсом з капюшынай, капустай і інш. Ураджаі ўсіх расьлін на гэтым балоце вельмі добрыя: віка—аўсяная мешаніна дала да 500 пуд. сена з дзесяціны.

Пайшчыкі Зубараўскага мэліарацыйнага таварыства, якія год яшчэ назад з недавер'ем адносіліся да агрыкультурных мерапрыемстваў, цяпер кажуць:

— Ніякая доўгая зіма нам ня страшна, сена хопіць.

Суседзі іхныя—Сьлюнькаўскае мэліарацыйнае таварыства—ужо канчаюць дэтальную асушку свайго балота і прызначаюць яго дзеля інтэнсыўнай культуры.

Крупень.

Амсьціслаўскі раён.

Трактар працуе на асушаным балоце.

Вучымся гаспадарыць пакультурнаму.

У канцы сьнежня месяца мінулага году у вёсцы Іванаўску адчыніліся аднатыднёвыя сельска-гаспадарчыя курсы. На курсах былі прачытаны лекцыі па вэтэрынарыі, жывёлаводству і палявodству. З боку сялян наглядалася вялікая зацікаўленасьць курсамі. За два-тры кілёмэтры, ня гледзячы на завіруху, кожны дзень прыходзілі старыкі па вечарох на лекцыі з розных пасёлкаў. Па сканчэньні курсаў больш актыўным слухачом разданы былі каштоўныя кніжкі па сельскай гаспадарцы.

Выніні курсаў: -ДВА ПАСЁЛКІ зараз-жа далі згоду перайсьці на шматпольле і ўнесьлі ў сельска-гаспадарчую каапэрацыю задатак на насеньне культурных траў.

Т. ЧЫЖ.

В. Іванаўск, Магілеўшчына.

За грамаду, за культуру.

Чым ноч цямей, тым ярчэй зорка.

Цёмны куток Беларусі вёска Дворышча—дваццаць пяць вёрст ад чыгункі, дваццаць пяць—ад райвыканкому; навокал вазёры, лясы ды балоты... Але яркім аганьком сярод акаляючай цемры гарыць, запаленая работчаю сялянскай, уладай сьвечачка—мясцовая сямёхгодка. Цяжкія ўмовы для працы:—амаль няма бібліятэкі, не хапае падручнікаў, газэтку калі атрымаеш, дык ёй ужо дзён пяць, або месьяц, у горадзе ўжо даўно пра тыя падзеі забыліся, якія для нас—апошнія навіны.

Вось і надумаўся калектыў настаўнікаў сямёхгодкі супольна з працаўнікамі сельсавету правесьці ў Дворышчанскую глуш і цемру новы чырвоны прамень—задумалі пабудаваць пры сямёхгодцы радыё з гучнагаварыцелем.

Ахвотна адгукнуліся сяляне на цікавую навіну і ўжо праз два тыдні было сабрана **звыш ста дваццаці рублёў**. Зараз праца на збору сродкаў яшчэ разгортываецца, падрыхтоўваецца ўжо дрова для мачтаў і ў хуткім часе наш мядзьвежы куток зьвяжыцца праз радыё са ўсім культурным сьветам.

З. Матукоўскі.

Расонскі р., Полаччына.



Школа у в. Вялікай Гарожы (Бабруйшчына), пабудованая на сродкі саміх сялян.

Дайце кнігу.

У гэтым годзе хлопцы вёскі пад кіраўніцтвам настаўніка арганізавалі гурток ліквідацыі маланісьменнасьці.

Сябры гуртка вучацца з ахвотай і маюць вялікае жаданьне да чытаньня кніг, але іх у вёсцы няма. Трэба, каб райкультаддзел даў бібліятэку, або шэф (ЦВК і СНК БССР) паклапаціліся над справай дастаўкі кніг.

К. К.

В. Чачкава, Заслаўск. р., Меншчына.



Ажыцьцяўляем лёзунг Леніна—электрыфікуем краіну.

ЯК БССР МОЖА СТАЦЬ КРАІНАЙ ІНДУСТРЫЯЛЬНАЙ.

Ператварэньне БССР з краіны земляробства ў прамысловую можа быць ажыцьцёўлена толькі тады, калі прамысловаць мае цьвёрдую энэргетычную базу, калі можна выкарыстаць наличча энэргетычных рэсурсаў: ваду, дровы, торф.

Водныя рэсурсы ў нас невялікія. Застаецца апал, на які нам і трэба арыентавацца. Галоўныя рэсурсы апалу ў нас—драўніна і торф. Калі прыняць пад увагу, што дравяны апал за час імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны нішчыўся без усякага плану, ня лічачыся з прыростам лясоў, дык асноўным відам апалу ў нас застаецца торф.

Тарфяныя масавы Беларусі раскіданы па ўсёй рэспубліцы. Дзякуючы гэтаму, самае эканамічнае выкарыстаць гэтыя рэсурсы на месцы, ператварыўшы іх у электрычную энэргію і перадаўшы яе на вялікую адлегласьць па фабрыках і заводах.

ЧАМУ МЫ БУДУЕМ АСІНАСТРОЙ.

Выконваючы завет Леніна—электрыфікацыя краіны—мы прыступілі да пабудовы вялікай райённай электрастанцыі—Асінастрою. Пабудова Асінастрою мае мэту разьвіць адсталую беларускую прамысловасьць і асабліва прамысловасьць усходняй часткі БССР, даючы ёй магчымасьць атрымліваць танную энэргію.

Да ажыцьцяўленьня гэтага вялікага мерапрыемства мы прыступілі летам 1927 году. Падрыхтоўчыя работы вядуцца ўзмоцненым тэмпам і частка іх ужо закончана. Праводзяцца работы па жыльлёвым будаўніцтве і дабрабыту. Будуюцца пасёлкі як для рабочых, якія працуюць там у сучасны момант, так і для персаналу, які будзе абслугоўваць Асінастрой.

Летам 1928 году распачнецца пабудова галоўнага будынку ў Арэхах і пабудова ўсіх паніжаючых падстанцый у мясцох спажываньня энэргіі. Для гэтага загатоўлены адпаведныя будаўнічыя матар'ялы (цэмант, драўніна, металы і інш.).

МЯСЦОВАЯ ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫЯ.

Апроч райённай электрастанцыі, мы вядзём вялікія работы па мясцовай электрыфікацыі — узмацняем станцыі агульнага карыстаньня.

На Менскай гарадзкой электрастанцыі ўстаноўлен турбагенэратар у 1500 кілёват, і, такім чынам, яна мае магутнасьць к а л я 3000 кілёват. Аднак, і гэтага для Менску ўжо мала. Прымаючы пад увагу натуральны і мэханічны рост насяленьня і павялічэньне культурных запатрабаваньняў яго, мы мусім і далей узмацняць Менскую электрастанцыю. У бліжэйшы час мае быць пастаўлен яшчэ адзін турбагенэратар у 3000 кілёват. Гэта дасьць магчымасьць у большай меры абслужыць насяленьне, дзяржаўную і мясцовую прамысловасьць, трамвай і і інш.

У Гомелі таксама ўстаноўлен турбагенэратар у 1500 кілёват, і, такім чынам, агульная магутнасьць Гомельскае станцыі дасягае 2000 кілёват, што дае магчымасьць далучыць да станцыі прамысловыя прадпрыемствы і ў большай меры ахапіць насяленьне. Тое самае робіцца і па шэрагу іншых буйных гарадоў БССР.

ЛЯМПАЧКА ІЛЬЛІЧА Ў ВЁСЦЫ.

З усяго гэтага відаць, што мы ў галіне электрыфікацыі пакінулі далёка за сабою даваенны час. У галіне сельскай электрыфікацыі мы маем таксама вялікія дасягненьні. Выконваючы заветы Леніна, даём лямпачку вёсцы. Мы даём вёсцы ня толькі лямпачку, а прывозім электрычнасьцю ў рух малатарні, сячкарні і іншыя сельска-гаспадарчыя машыны.

Ужо складзен пяцігадовы плян электрыфікацыі ў сельскіх мясцовасьцях, і ў 1927-28 годзе будзе пабудован цэлы шэраг новых электрастанцый ў вёсцы на агульную суму 500000 рублёў.

На цэлым шэрагу прадпрыемстваў энэргетычная гаспадарка аднаўляецца і будуецца новая з выкарыстаньнем апошніх дасягненьняў тэхнікі.

Мы ідзём па шляху, вызначаным Леніным.

Мы пераконаны, што ў працягу бліжэйшых 10-15 год лёзунг Ільліча—электрыфікацыя краіны—будзе ажыцьцёўлен.

Новая вёска.

У пэрыядзе будаўніцтва і змаганьня з цемрай.

Нашы вёскі, жыўшы доўгія часы ў цемры, пачынаюць абуджацца і сваімі сіламі скідаюць быўшае ярмо цемнаты.

Вёска будуецца. Нізкія, пахілыя, са згорбленымі сьпінамі сялянскія хаты замяняюцца новымі з паўтарааршыновымі вокнамі.

Цемра—векавечны вораг глухіх куткоў—пачынае зьнікаць; адчыняецца больш школ, дзе сялянскія дзеці набываюць грамату.

У многіх вёсках нашага райёну адчынены хаты-чытальні, нардамы, чырвоныя куткі.

Сяляне часткай зьнішчылі нясьменнасьць і з вялікаю ахвотаю чытаюць газэты, цікавяцца палітычнымі і гаспададарчымі пытаньнямі.

Шырока разгарнула на райёну сваю дзейнасьць каапэрацыя: у вёсках адчынены каапэратывы, лік пайшчыкаў павялічаецца—беднату залічаюць у пайшчыкі на сродкі каапэратываў.

Добра паставілі працу і працуюць на вёсках парт'ячэйкі і ячэйкі ЛЕСМЯ, якія ў курсе ўсёй справы на вёсцы.

Вырастае трэцяе пакаленьне—інжынэры, лік якіх усё павялічваецца.

Надта шпарка ідзе будаўніцтва, і кожны грамадзянін адчувае сябе вольна і ведае, што ва ўсіх выпадках яму дапаможа яго-ж улада.

І гледзячы на ўсё гэта, трэба сказаць, што вёска ўваходзіць у новы пэрыяд жыцьця—у пэрыяд будаўніцтва, змаганьня з цемраю.

Глухія куткі абуджаюцца, прамень новага жыцьця заглянуў скрозь шыбы, балоты і лясы, і недалёка той час, калі ўся вёска будзе граматнаю, культурнаю.

Алесь Калевіч.

В. Восава, Капыльскі р., Меншчына.



Электрыфікаваная сялянская хата ў в. Зарэчча.

3½ МІЛІЁНЫ УПАРАДКАВАНАЙ ЗЯМЛІ.

Да гэтага часу ў БССР земляўпарадкавана 3.409.544 гэкт. ці 38,7 проц. усяго пляну зямлі.—За апошнія гады было надзелена 12.288 безьзямельных і дадзелена 54.819 малазямельных сялянскіх двароў.—Летась было вызвалена ад платы за земляўпарадкаваньне бяднейшае сялянства на агульную суму 166.894 руб.—Белсельбанк выдаў доўгатэрміновыя крэдыты на земляўпарадкаваньне ў суме 1.058.000 руб.

За мінулы 1926-27 г. было праведзена земляўпарадкаваньне ў наступных разьмерах:

1) На ўнутрасяленным земляўпарадкаваньні 269.401 гэкт., 2) па адводу зямель спэцыяльнага прызначэньня і адмежаваньні зямель дзяржаўнай маемасьці 29.152 гэкт., 3) па адмежаваньні гарадоў і зямельнай рэгістрацыі—5861 гэкт. і 4) па земляадзяленьні бязьзямельных і малазямельных гаспадарак—88.513 гэкт., а ўсяго разам—392.427 гэкт. Плянавае заданьне па земляўпарадкаваньні выканана на 93,7 проц.

У працягу мінулага году ў выніку работ па ўнутрасяленным земляўпарадкаваньні арганізаваны наступныя землякарыстаньні: 1085 пасёлкаў (11.010 двароў), 107 вёсак упарадкаваны на месьце і пераведзены на шматпольле 5.806 двароў, адрубаў і хутароў—8257 двароў, 66 калектыўных гаспадарак (1.069 двароў), 201 прырэзка насельніцтву (2.590 гэкт.), 1.028 вучасткаў грамадзкага карыстаньня (11.115 гэкт.) і 297 вучасткаў лесу мясцовага значэньня (10.570 гэкт).

Такім чынам, мы бачым, што ўпарадкаваньне пасёлкаў і вёсак па месцы складае 65,5 проц., хутары і адрубы 31,8 проц. і калектывы—3,6 проц.

Групавыя і таварыскія формы землякарыстаньня складаюць 67,1 проц. усяго земляўпарадкаванага пляцу.

Асаблівая ўвага была зьвернута ў мінулым годзе на ўвязку земляўпарадкаваньня з агранамічнай, мэліарацыйнай і мерапрыемствамі па перасяленьні. Агранамічны пэрсанал прымаў непасрэдны ўдзел у складаньні вытворчых плянаў земляўпарадкаваньня, устанаўленьні форм землякарыстаньня, устанаўленьні тыпу гаспадарак, быў арганізован нагляд аграномаў за далейшым правядзеньнем шматпольля і г. д. У галіне мэліарацыі гэта ўвязка праводзілася на лініі ўзгадненьня земляўпарадкаваўчых плянаў з мэліарацыйнымі, у адначасовым правядзеньні земляўпарадкаваньня і мэліарацыі і інш. у тых вёсках, дзе прадбачылася перасяленьне груп сялянства ў інш. райёны, земляўпарадкаўчыя работы на час затрымліваліся, пакуль ня будзе закончана перасяленьне, каб, такім чынам, разьмеркаваць больш мэтазгодна землі перасяленцаў.

Адзэй з асноўных земляўпарадкаўчых работ у мінулым годзе зьяўлялася земляўпарадкаваньне безьзямельнага і малазямельнага сялянства. З 1925 г. да 1-га кастрычніка 1927 г. было надзелена 12.288 безьзямельных двароў (60.926 едакоў) і дадзелена 54.819 малазямельныя сялянскія двары (240228 едакоў). Пры разьмеркаваньні фондаў у першую чаргу здавальняліся сем'і чырвонаармейцаў. Дзеля гэтага выкарыстоўваліся землі, галоўным чынам, з лясных фондаў. Апроч таго, пры ўнутрысяленным земляўпарадкаваньні за кошт абрэзкаў і інш. зямель надзелены, апрача вышэй пададзеных, яшчэ 1302 безьзямельныя двары (6380 едакоў) і данадзелена 6232 малазямельныя двары (31602 едакі).

Зусім слушна, што для правядзеньня земляўпарадкаваньня ў такіх разьмерах патрэбны і вялікія грошы.

Апрача платнага земляўпарадкаваньня, праводзілася яшчэ ільготнае. Усяго летась было прадастаўлена ільгот па земляўпарадкаваньні 83.450 гэкт., ці па суму 166.894 руб. Апроч таго, Белсельбанк адпусьціў месцам 1.058.000 р. доўгатэрміновага крэдыту на земляўпарадкаваньне, на травасеяньне і інш.

Калі-ж узяць агульны пляц зямлі БССР у 8.800.000 гэкт., якія падлягаюць земляўпарадкаваньню, то на 1-га кастрычніка 1927 г. земляўпарадкавана 3.409.544 гэкт., ці 38,7 пр. (з гэтае лічбы 9,8 проц. праведзена да рэвалюцыі і 28,9 проц. пры сав. уладзе).

Расьцём культурна і эканамічна.

Наш сельсавет расьце з кожным годам.

Разам з ростам гаспадарак значна ўзрасла колькасьць жывёлы. Напрыклад, калі ў 1925 годзе было кароў 960 шт., дык цяпер маем 1059 шт., коняй было 554, цяпер 590, ды яшчэ цёлак 290 і жарабкоў 96 штук.

Пашырылася культурная апрацоўка зямлі: маем 2 арцелі, адну культ-гаспадарку. У арцелях працуе 73 асобы. Бясконных паменшылася напалову.

Навысілася грамадзкая думка і настрой сялян да арганізацыі. 75 проц. гаспадарак ужо пайшчыкі каапэрацыі. Беднаты каапэравана 95 гаспадарак.

Па сельсавету ёсьць адна дабрахвотная пажарная дружына з 33 сябрамі.

Дабрабыт вёскі паляпшаецца.

Ёсьць камсамольская ячэйка з 16 сябрамі, ячэйка МОПР'у—22 члены, Асоавіяхіму—35 членаў, піанэратрад—22 чал. Працуюць 3 школы, у якіх навучаецца 222 вучні, з іх 96 дзяўчат. Ёсьць хата-чытальня. Па с.-савету выпісваецца адна газэта на 3—5 двароў.

Усе паказаныя лічбы сьведчаць нам аб тым, што мы расьцём з боку культурна-эканамічнага, што можа палепшыць наша становішча і стаць крапчэй ва ўсіх галінах нашага дабрабыту. Вось як мы думаем і будзем ісьці па шляху да сацыялізму.

Л. Акінчыц.

Бабоўкі с.-с., Жлобінск. р., Бабруйшчына.

Каапэрацыя—шлях да сацыялізму.

З дапамогай каапэрацыі ўзьнімаем гаспадарку.

Круглянскае сельска-гаспадарчае т-ва налічвае звыш 2080 пайшчыкаў, якія па сацыяльнаму складу падзяляюцца наступным чынам: беднякоў—25 пр., сераднякоў—73 проц. і заможных—2 проц.

Пазыкі за мінулы гаспадарчы год выдана 1480 асобам на суму 72817 руб., з якіх беднаце выдана 22242 руб. Лік бясконных, атрымаўшых пазыку, складае 221 асобу, якім выдана 18432 р. Пазыка выдавалася на набыцьцё коняй, кароў, машын с.-г., будынкаў і насеньня.

Пазвы капітал т-ва складае 14281 руб., кожны пайшчык дае 5 руб. на пай, 50 к. уступных і 1 р. на таварныя апэрацыі.

Вядзе т-ва і культурную працу. Узята шэфства над вясковым піанэр-атрадам, якому дана літаратура; выдаткі летам на ясьлі ў вёску 50 рублёў; адчынены каапэрацыйны куток у вясковай хаце-чытальні, праводзіліся кампаніі па сельска-гаспадарчых пытаньнях.

Арганізаваны 2 арцелі агнятрывалага будаўніцтва. У далейшай працы пажадана пашырыць лік каапэраванага гаспадарак і культпрацу. Неабходна дапамагчы нардому змусіць гаварыць радыё-прыёмнік, які стаіць без усялякай карысьці. Каапэрацыйныя куткі адчыніць пры кожнай хаце-чытальні.

Т-ва пабудавала добры ўласны будынак, у якім зьмяшчаецца канцэлярыя, склад і крама.

Мясцовы.

С. Круглае, Аршанскай акругі.

Апора бедняка.

Адбыўся сход беднаты найнікаў сельска-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі В.-Крушынаўскага сельсавету. Прысутнічала 52 пайнікі-беднякі. Па парадку дня стаялі пытаньні: значэньне с.-г. каапэрацыі для сялянства і абгаварэньне кандыдатур у склад упаўнаважаных. Па першаму дакладу сялянін-бядняк адзначылі:

— С.-г. каапэрацыя — гэта шлях узьняцьця бедняка на ногі.

У канцы сходу нарашылі папоўніць паі да 10 рублёў, беднякам-жа даць адсрочку і па магчымасьці ўсім уступіць у каапэрацыю ў бліжэйшыя дні.

Я. М. С.

В. В.-Крушынаўка, Рагачоўскага раёну.

З успамінаў пра Ул. І. Леніна.

В. КРАЕУСКІ*).

І. НАЛЁНДАНСКІМ ЗЬЕЗЬДЗЕ

Першы раз я ўбачыў Уладзіміра Ільліча на Лёнданскім зьезьдзе ў 1907 годзе. Яго самаўладаньне, яго спакойная сіла і цьвёрдасьць зрабілі на мяне нязвычайнае ўражаньне. У часе самых гарачых сутычак на зьезьдзе, калі атмасфэра раскалялася, калі Плэханаў нэрваваўся, калі Мартаў амаль што не ўпадаў у гістэрыку, калі Цэрэтэлі пасылаў пруны і маланку—Ленін заставаўся непарушна спакойным і толькі па-свойму ўсьміхаўся. Гэта была ўсьмешка чалавека, які—скрозь шуміху бягучага моманту—бачыць далёкую будучыню, які—адзін са ўсіх—здрозьнівае контуры насьпяваючых вялікіх здарэньняў. Я ў той час быў яшчэ маладым партыйным працаўніком (як член польскай сацыял-дэмакратычнай партыі, я на гэтым зьезьдзе наогул упяршыню блізка сустрэўся з расейскімі таварышамі) і тады я не ўяўляў сабе яшчэ ў поўнай меры, наколькі далей за ўсіх іншых бачыць Уладзімір Ільліч. Але што ён бачыць далей за іншых, што не Плэханаў, ня Мартаў, не Аксэльрод, а Ленін зьяўляецца самай буйнай фігурай на гэтым зьезьдзе—гэта так выразна кідалася ў вочы, што нельга было гэтага ня бачыць.

Я ня зьбіраюся пісаць сваіх успамінаў пра Лёнданскі зьезд. Мне хацелася-б замацаваць на паперы ўсяго адзін момант маіх успамінаў. Гэта была гутарка ў маленькім лёнданскім рэстаране, дзе пасьля пасяджэньня сустрэліся за вячэрай Уладзімір Ільліч з Розай Люксэмбург і Тышка-Іогіхэсам. Разам з Ільлічом вячэрала тады некалькі таварышоў-бальшавікоў. Я папаў туды дзякуючы асабістай да мяне прыхільнасьці тав. Тышкі, які любіў «мацаць» маладое пакаленьне партыі і часта вадзіў мяне з сабой, разважаючы са мной па розныя тэмы, або, праўдзівей, выпытываючы мяне.

За вячэрай галоўнай тэмай гутарак былі, разумеецца, зьездаўскія хітрыкі меншавікоў. Гутарка зайшла наогул пра магчымасьць супольнай працы бальшавікоў і меншавікоў у адзінай партыі. Калі Ленін загаварыў пра падыходзячую нямінучасьць расколу партыі, хтосьці з прысутных выказаў думку, што раскол можа і не патрэбен. Калі на Захадзе ў рамках адзінай партыі магчыма няшчадная барацьба паміж марксістымі і рэвізіяністымі, дык, можа быць, і ў нас, ня гледзячы на ўсю завостранасьць фракцыйнай барацьбы, утворыцца ўсё-такі магчымасьць пэўнага замірэньня, магчымасьць захаваньня адзінства партыі.

А Ільліч, хвіліну памаўчаўшы, сказаў, па-свойму ўсьміхаючыся:

— Навошта-ж нам у гэтых адносінах браць прыклад з Заходняй Эўропы? Я прызнаю толькі адну форму замірэньня з палітычным ворагам: раздушыць!

Гэтыя словы, сказаныя без усялякага пафасу, урэзаліся мне ў памяць на ўсё жыцьцё.

II. АГУЛЬНА-ПАРТЫЙНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ Ў 1908 Г.

У сьнежні 1908 году я, як дэлегат ад польскай с-д, паехаў у Парыж на агульна-партыйную канфэрэнцыю. Сярод меншавікоў пачаў тады моцна разьвівацца ліквідатарскі рух, і барацьба паміж бальшавікамі і меншавікамі завастрылася да крайнасьцяў. У часе спрэчак на канфэрэнцыі ўзьнікла пытаньне аб узброеным паўстаньні.

Дай заявіў:

— Ня трэба перціся туды, дзе раз ужо былі разьбіты.

Трэба было бачыць, як сярдзіта Ільліч накінуўся на Дана за гэтыя словы. Падхапіўшы яго словы, ён кінуў меншавікам у адказ:

— Мы якраз будзем перціся туды, дзе былі раз разьбіты!

Але на гэтай-жа канфэрэнцыі, няшчадна змагаючыся з меншавіцкім апартунізмам, выдзекуючыся з трусасьці меншавікоў,—Уладзімір Ільліч адначасна навінен быў весьці незамірымую барацьбу ўнутры сваёй уласнай фракцыі. Бо бальшавіцкая фракцыя ў той час далёка ня была адзіным цэлым. Як гэта бывае заўсёды ў першы пэрыяд пасьля перамогі контр-рэвалюцыі, і сярод рэвалюцыйнага авангарду рабочай клясы ўзьніклі розногалосьсі, пачала разьвівацца ўнутраная барацьба.

Гэта быў момант, калі Ленін, вучачыся на вопыце перамагаў і паражэньне рэвалюцыі 1905-7 году, рабіў патрэбныя пад аўкі ў тэорыі і практыцы бальшавізму. На канфэрэнцыі 1908 году былі ў бальшавіцкай фракцыі гэтак званыя адзавісты і ультыматысты. Наколькі я памятаю, т. Лядаў быў прадстаўніком адзавістаў, недзярлівых рэвалюцыянэраў, якія не маглі «замірыцца» з фактам паражэньня рэвалюцыі, з марудным ходам здарэньняў, з неабходнасьцю ўпартай, сыстэматычнай, марудной рэвалюцыйнай працы—і якія вымагалі «адзаваньня» с.-д. фракцыі і «рашучай» барацьбы з самаўладзтвам.

«Ультыматысты» былі настроены больш «прымірыма». Яны вымагалі толькі, каб думскай фракцыі быў пастаўлен ультыматум: „направіцца" ў пэўны тэрмін і выкарыстаць думскую трыбуну дзеля запраўды-рэвалюцыйнай працы. Прадстаўніком ультыматыстаў на канфэрэнцыі быў А. Багданаў-Максімаў.

Уладзімір Ільліч самым рашучым чынам выступіў як супроць адзавізму, так і супроць ультыматызму, даказваючы, што палітычнае становішча грунтоўна перамянілася і што гэта перамена вымагае належнай перамены тактыкі.

— Ні па якія крайнасьці мы ня пойдзем. Мы навучымся выкарыстоўваць Дзяржаўную Думу па-бальшавіцку!—упарта і ўпэўнена паўтараў ён на канфэрэнцыі.

III. У ПЕРШЫЯ ДНІ СУСЬВЕТНАЙ ВАЙНЫ.

Мне давялося бачыць Уладзіміра Ільліча ў самым пачатку сусьветнай вайны. З выгляду такі самы спакойны, як заўсёды. Але гледзячы на яго, нельга было не адчуваць, што ўжо ў тыя дні ён рыхтаваўся да зялікай помсты, што ён зьбірае ўсе свае сілы дзеля надыходзячай гіганцкай барацьбы, якую ён бачыў, адчуваў так выразна, нібы яна ўжо разьвіналася ва ўсю сваю шырыню. У гэтыя дні ён быў заўжды гатоў да чынасьці, да барацьбы.

Ленін паставіў сабе гіганцкую задачу. Але ён ведаў і сваю гіганцкую моц.

Ён спакойна абмяркоўваў усе шансы будучай барацьбы, ён улічваў усё «за» і «супроць». Ён ня цешыў сябе ніякімі марамі, ён выразна бачыў усю складанасьць, усю цяжкасьць становішча.

Аднак, нават яго ашарашыла першая вестка пра здраду нямецкіх сацыял-дэмакратаў. Ужо як ён ненавідзеў трусьлівых апартунізм рэвізіяністых, ужо як ён не давяраў «артадаксальным марксістым» каўцкіанскага толку,—а ўсё-такі, калі прышлі першыя весткі пра здраду нямецкіх с-д, пра тое, што рэвізіяністы і каўцкіанцы аб'ядналіся над сьцягам «абароны бацькаўшчыны» і галасавалі за ваенныя крэдыты ўраду кайзэра,—нават Ільліч у першы момант не паверыў. Я памятую, як ён, зірнуўшы на «Форвэртс», тагочасны орган артадаксальных марксістых, які яшчэ ўчора друкаваў натхнёныя адозвы супроць вайны, а сёньня агалашаў ганебную дэклярацыю с.-д. парляманцкай фракцыі, ускрыкнуў:

— Ды не, гэта мана! Гэта падрабілі яны, паны імпэрыялісты! Запраўдны «Форвэртс» папэўне сканфіскаваны!

Але пералістаўшы ўвесь нумар ён змоўк.

На другі дзень, чытаючы нямецкія сацыял-дэмакратычныя газэты, ён толькі падсьмейваўся з сябе, што здрада нямецкіх сацыял-дэмакратаў магла здавацца яму немагчымай.

— Як відаць, мы недаацанілі іх,—казаў ён,—яны здольны на ўсё. Мы яшчэ ня тое ўбачым!

І тут жа ён накінуўся на аднаго з нас, выказаўшага думку, што, можа быць, развой крывавых здарэньняў адціхне каўцкіанцаў ад палітыманьня імпэрыялізму:

— Ну, не! На гэта не спадзявайцеся! З гэтага шляху звароту няма!

Наколькі цьвяроза Уладзімір Ільліч ацэньваў становішча, відаць і з таго, што ў першыя-ж тыдні вайны ён стаў высьмейваць тагочасныя гутаркі, што вайна не працягнецца больш 3-6 месяцаў, асабліва завярэньні Каўцкага, што так высока разьвіты капіталізм ня зможа вытрымаць доўгай вайны.

— Толькі падумайце. Гэта-ж барацьбанай вялікшых імпэрыялістычных дзяржаў, барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць. Ці-ж яны могуць прызнаць сябе пераможанымі, ня вычарпаўшы ўсіх сродкаў?! Раней, чымся праз якіх-небудзь гады тры гэта вайна напэўне ня скончыцца,—казаў нам Уладзімір Ільліч.

Мы тады не згаджаліся з Ільлічом. Прышлося, аднак, пераканацца, што і на гэты раз ён быў правы.

IV. Р. МАЛІНОЎСКІ Ў ПАРОНІНЕ.

За некалькі тыдняў да вайны, калі Ленін быў у Галіцыі і жыў на дачы ў Белым Дунайцы (коля Пароніна, у некалькі вярстох ад гораду Закопанэ), да яго прыехаў Раман Маліноўскі, які па незразумелых тады для нас прычынах здаў мандат дэпутата ў Дзяржаўную Думу і праз нейкі час зьявіўся да Леніна з павінай галавой. Маліноўскі пасяліўся ў Пароніне, дзе ў той час жыло некалькі таварышоў з польскай С. Д.

Аб тым, што Маліноўскі правакатар, ніхто з нас, разумеецца, не дагадваўся. Але ў сувязі з выхадам Маліноўскага з Думы ў пацярбурскай меншавіцкай газэце (здаецца, тады выхадзіла «Новая Рабочая Газета») зьявілася заметка, намякаючая на тое, што Маліноўскі—правакатар; але заметка не падавала ніякіх данных дзеля пацьверджаньня гэтага абвінавачаньня.

Яшчэ да прыезду Маліноўскага ў Пароніп была вызначана дасьледчая камісія па яго справе. Камісія падрабязгова разглядзела па гэтай справе ўсё, што было даступна. На жаль, даступных данных было зусім мала. Ніякіх сьцьверджаньняў правакацыі Маліноўскага камісія не знайшла; меншавікі таксама адказалі маўчаньнем на публічны запрос Уладзіміра Ільліча наконт правакацыі Маліноўскага.

Тым часам прыехаў і сам Маліноўскі. Дапрошаны Ільлічом аб прычынах яго выхаду з Думы, Маліноўскі стаў розным чынам выкручвацца. Але калі Ільліч стаў яшчэ настойлівей, Маліноўскі даў зразумець, што прычыны яго ўчынку проста рамантычнага характару: пібы-та ён, кінуўшы палітычную працу, кінуўшы сям'ю, паехаў за граніцу за нейкай жанчынай. Зараз ён апамятаўся і зьяўляецца да Ільліча з павінай галавой.

— Чорт ведае, што думаць пра ўсё гэта. Можа ён і праўду кажа. Але тады ён пры ўсіх сваіх аграмадных здольнасьцях, пры сваім палітычным тэмпэраманце проста сумазброд і безадказны чалавек. Яго трэба выключыць. Тут нічога ня зробіш!—разважаў Ленін.

Выключэньне з партыі для Маліноўскага было зусім нечаканым.

Перад самым пачаткам сусьветнай вайны Маліноўскі паехаў у Расею, каб—як ён казаў—заслужыць сабе іншую даверэ'е партыі. Праз нейкі час мы, жывучы ўжо ў Швэйцарыі, атрымалі вестку, што Маліноўскі ўзят на фронт, а затым, што ён, цяжка ранены ў бойцы, памёр у аўстрыйскім палоне. Чуткі гэтыя пасьля аказаліся фальшывымі: Маліноўскі папаў жывым у палон. Вярнуўшыся ў канцы 1918 году ў РСФСР, ён быў прыгавораны да караньня сьмерцю і расстраляны.

(Канец у наступным нумары).

*) Аўтар успамінаў—стары рэвалюцыянэр, стары член польскай сацыял-дэмакратычнай партыі. Браў удзел у ўтварэньні кампартыі Польшчы. Быў членам ЦК.

РЭДАКЦЫЯ.

Вялікі камуністычны працэс.

У лютага г. г. у Беластоку пачнецца працэс проці 133 членаў кампартыі Зах. Беларусі з Беластоцкага, Сакольскага і Бельскага паветаў, якія былі арыштаваны яшчэ ў 1925 г. Акт абвінавачаньня занімае 419 старонак. З боку абвінавачаньня выклікаецца звыш 200 сьведак. Працэс пратрывае каля двух месяцаў.

ІЗНОЎ ЦКУЮЦЬ.

Віленскае манархічнае „Слово" піша, што на правінцыі ідзе патаемная, але ўпартая агітацыя Грамады, якая скіравана галоўным чынам у кірунку распальваньня клясавых антаганізмаў: „зрабіць парадак з абшарнікамі і інтэлігэнцыяй". Другім, ня менш важным, матывам агітацыі зьяўляецца працэс Грамады. Абвінавачаныя грамадаўцы прадстаўляюцца, як мучанікі за народ.

Фашысцкі паход на канстытуцыю.

ВАРШАВА, 20-1. Агалошана перавыбарчая адозва беспартыйнага «блёку супрацоўніцтва з урадам». У адозве зазначана, што ранейшыя соймы не апраўдалі надзей польскае нацыі. Будучыя заканадаўчыя палаты, кажа адозва, павінны пераглядзець канстытуцыю, узмацніць уладу прэзыдэнта і разьмежаваць кампэтэнцыю заканадаўчае і выканаўчае ўлады. Пад адозваю 360 подпісаў. У пераважнай большасьці прозьвішчы падпісаўшых адозву зусім невядомы шырокай публіцы. Аднак, у іх ліку ёсьць подпісы прадстаўнікоў прамысловасьці, гандлю і банкаў, а таксама прадстаўнікоў буйных абшарнікаў кансэрватыўнага лягеру.

ЛІТОУСКІ АДКАЗ НА ПОЛЬСКУЮ НОТУ.

Латвійскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што літоўскі ўрад даў наступны адказ на польскую ноту:

1) Польшча ня выканала прынятых на сябе абавязкаў; 2) Польшча ня спыніла арганізацыі арміі эмігрантаў пад правадырствам Плячкайціса. Тыя, хто належыць да гэтай арміі, абмундураваны і ўзброены Польшчай і знаходзяцца ў кашарах у Лідзе.

Што тычыцца гаспадарчых праэктаў з боку Польшчы, дык адказ сьцьвярджае адсутнасьць канкрэтных праэктаў аб разьмерах гэтых пераговараў, што Літва лічыць неабходным. Літва прапануе наноўніць праграму пераговараў пытаньнем аб ліквідацыі наступстваў вайны, г. б. аб „Жэлігоўскім".

Урэшце Літва пытаецца, як Польшча вымабражае сабе пераговары,—ці з удзелам Лігі Нацый, ці без яе.

БАРЫКАДЫ НА ВУЛІЦАХ ХАНЬКОУ.

ПЕКІН, 20-1. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Ханькоу, што там уведзена ваеннае становішча, бо ўлада баіцца камуністычнага паўстаньня. На вуліцах гораду пастаўлены барыкады.

АРЫШТ КАМСАМОЛЬЦАЎ

ШАНХАЙ, 18-1. У прыгарадзе Шанхаю арыштавана 7 кітайскіх камсамольцаў. Водлуг паведамленьня газэт, пры арышце знойдзены рэвалюцыйная літаратура і вінтоўкі.

ПРАГРАМА ЧАН-КАЙ-ШЫ.

ШАНХАЙ, 20-1. У агалошанай Чан-Кай-Шы заяве аб праграме Гаміндану ў галіне замежнае і ўнутранае палітыкі зьмяшчасьцца абяцаньне ўвесьці рабочае заканадаўніцтва. Заява далей абяцае «ахоўваць інтарэсы рабочых і падтрымліваць спакой у прамысловасьці». Апроч таго, заява ў галіне ўнутранае палітыкі кажа наступнае: барацьба з камуністычнымі лёзунгамі і юнацкім рухам, якія маюць сваёю мэтаю ярунаваньне, забарона народных дэманстрацый да распрацоўкі ЦК Гаміндану пляну і лёзунгаў такіх дэманстрацый і скліканьне нацыянальнага збору для падрыхтоўкі паўночнае экспэдыцыі.

У ШУКАНЬНІ „ПРАЦЫ".

ШАНХАЙ, 19-1. Паведамляюць, што вядомы белагвардзейскі генэрал Пячаеў прыехаў у Шанхай з Цыдао.

РАСТРЭЛ ПЕКІНСКАГА РЭВАЛЮЦЫЯНЭРА.

ПЕКІН, 20-1. У Пекіне пакаран сьмерцю Сін-Шао-Цьзін, арыштаваны па абвінавачаньні ў камуністычнай дзейнасьці. Перад пакараньнем сьмерцю арыштаванага правялі па вуліцах гораду. В іншых, арыштаваных разам з Сін-Шао-Цьзінам, засуджана да катаржнае працы на розныя тэрміны.

ЧЭХАСЛАВАЦКАЯ ЗБРОЯ ПАЎНОЧЦАМ.

НЬЮ-ЁРК, 19-1. «Асошыэйтэд Прэс» паведамляе з Манілы, што, водлуг заявы ня газэты «Маніла Бюлетын», японскі крайсэр „Охі" вартуе чэхаславацкі параход «Прага» з грузам зброі, як відаць прызначанае для Чжан-Цзо-Ліна.

БАРАЦЬБА ПАД ЛЁЗУНГАМІ КАМПАРТЫІ

НЯМЕЦКІЯ МЭТАЛЁЎЦЫ НЯ ПОЙДУЦЬ НА АДСТУПЛЕНЬНЕ.

БЭРЛІН, 19-1. 18-га студзеня ў Магдэбурге адбыўся сход бастуючых мэталёўцаў. Сход выказаўся за рашучае працяжэньне патрабаваньня аб павышэньні заработку. Лёзунгі камуністаў, якія заклікаюць усе працярыемствы да барацьбы і ня спыняць забастоўку паваг наперакор абвяшчэньню абавязковымі трацэйскіх пастаноў, чытку бюджэту.

У АПОШНІ ЧАС.

(Атрымана а 1 гадз. уночы).

РАЗБРОЕНЬНЕ РАСЕЙСКІХ БЕЛАГВАРДЗЕЙЦАЎ У АРМІІ ЧАН-ЦЗУН-ЧАНА.

ШАНХАЙ, 20-1. Расейскія белагвардзейскія часьці арміі Чжан-Цзун-Чана расфармаваны. Белагвардзейцы, незадоволеныя адносінамі да іх і невыплатай пэнсіі, занялі і трымалі на працягу 7-мі месяцаў невялікую крэпасьць у Шандунскай правінцыі. Пасьля асады, якая цягнулася 28 дзён, белагвардзейцы, згубіўшы 52 чал. забітымі, здаліся і былі разброены, за выключэньнем конных часьці. Камандзір белагвардзейскіх атрадаў арміі Чжан-Цзун-Чана Нячаеў выехаў у Парыж.

АБМЕН РАТЫФІКАЦЫЙНЫМІ ГРАМАТАМІ МІЖ СССР І ЭСТОНІЯЙ.

МАСКВА, 20-1. 20-га студзеня ў Народным Камісарыяце па Чужаземных Справах членам калегіі Стаманякоўскім і эстонскім пасланьнікам Ларэцей быў зроблен абмен ратыфікацыйнымі граматамі згоды аб парадку вырашэньня канфліктаў мірнага значэньня між СССР і Эстоніяй.

У Саюзе ССР.

У партыю Ільліча.

КАСТРАМА, 19-1. Губком УсеКП(б) разаслаў ліст партыйным арганізацыям, якіх заклікае разгарнуць працу па ўцягненьню ў партыю рабочых, у зьвязку з гадавінаю сьмерці Леніна.

У фабрычным райёне 36 тэкстыльшчыкаў падалі заяву аб уваходзе ў ленінскія шэрагі. У заяве яны пішуць: «Адчуваючы вялікую адказнасьць за справу пралетарскае рэвалюцыі, мы рашылі, што на 5-м годзе сьмерці Ільліча нельга рабочаму заставацца па-за шэрагамі партыі».

* * *

ВОЛАГДА, 19-1. Па губерні ў зьвязку з гадавінаю сьмерці Леніна шырэй разгарнулася кампанія па ўцягненьні ў партыю рабочых. Пададзена каля 150 заяў, з якіх палова зацьверджана мясцовым камітэтам.

Выданьне твораў Ул. Леніна.

МАСКВА, 19-I. Водлуг вестак Дзяржвыдату РСФСР, тыраж першага выданьня поўнага збору твораў Леніна меркаваўся ў 30.000 экзэмпляраў, але падпіска за першыя тры месяцы дала 46.000 экзэмпляраў, а да канца 1924 году было выпушчана першага выданьня каля 100.000 экзэмпляраў.

Вялізны попыт на творы Леніна прымусіў Дзяржвыдат РСФСР выпусьціць другое выданьне, больш дарагое, і трэцяе больш таннае. Першыя тыражы (30.000 для другога выданьня і 50.000 для трэцяга выданьня) разышліся поўнасьцю і прышлося выпусьціць дадатковыя тыражы. Да сьнежня 1927 году прынята падпіскі на другое выданьне 36.458, а на трэцяе выданьне — 102.931 экзэмпляр.

Ленінскія зборнікі разам з зборам твораў даюць цэльны малюнак жыцьця і творчасьці Уладзіміра Ільліча. Да гэтага часу выпушчана 6 ленінскіх зборнікаў. У 1928 годзе мяркуецца, апроч працягу выданьня поўнага збору твораў, таксама і выданьне асобных твораў Леніна для шырокіх колаў чытача. Будуць выдадзены «Дзяржава і Рэвалюцыя», «Што рабіць», «Аб дзіцячай хваробе лявізны ў камунізьме» і інш.

Да сучаснага моманту асобныя творы Леніна выдадзены на мовах польскай, яўрэйскай, казакскай, нямецкай, татарскай, узбэкскай, башкірскай і на іншых мовах народнасьцяў СССР.

ХЛЕБАЗАГАТОЎКІ НА НОВЫМ КІРУНКУ.

МАСКВА, 19-1. У трэцяй пяцідзёўцы студзеня па папярэдніх даных НК Гандлю СССР загатавана 158.287 тон хлебапрадуктаў, проці 101.511 тон, загатаваных у другой пяцідзёўцы, і 122 тысяч 300 тон, загатаваных у першай пяцідзёўцы студзеня. Усяго, такім чынам, у першай палове студзеня загатавана 382.200 тон хлебапрадуктаў проці 305.115 тон, загатаваных у другой палове сьнежня. Ажыўленьне загатовак у трэцяй пяцідзёўцы студзеня ад значаецца амаль па ўсіх райёнах і культурах. Загатоўкі жыта павялічыліся з 18.799 тон у другой пяцідзёўцы да 30.868 тон у трэцяй пяцідзёўцы студзеня. Павялічыліся таксама загатоўкі пшаніцы з 51.415 тон да 77.904 тон.

Да поўнага каапэраваньня беднаты.

МАСКВА, 19-I. За 2 гады (1925 26, 1926-27 г.) было адлічана з прыбыткаў спажывецкае каапэрацыі ў карысьць каапэраваньня беднаты 7 мілёнаў рублёў. Праз выкарыстаньне гэтых фондаў было ўцягнута ў каапэрацыю з 1925 да 1927 г. ня менш паўтара мілёны беднякоў. Аднак, процант уцягнутых у каапэрацыю бядняцкіх гушчаў вёскі адстае ад іншае часткі каапэраванага вясковага жыхарства. Цэнтрасаюз паставіў сваёй задачаю поўнасьцю каапэраваць вясковую беднату ў працягу бліжэйшых пяці гадоў. Для гэтае мэты штогод павінна адлічацца да 10 проц. з прыбыткаў у фонд каапэраваньня беднаты.

2-гі ўсебеларускі зьезд земляробаў-яўрэяў.

Яшчэ доўга да адчыненьня зьезду публіка запоўніла ўсе тры паверхі Беларускага Дзяржаўнага Тэатру.

Госьці інстыктыўна накіроўвалі сваю ўвагу на віноўнікаў урачыстасьці,—удзельнікаў зьезду. Тут можна было ўбачыць людзей усіх трох пакаленьняў: доўгабародыя, але яшчэ моцныя дзядулі, людзі сярэдняга ўзросту, якія, магчыма, некалькі год таму назад былі „людзьмі паветра", займаючыся,чым попала, абы так-сяк перакідацца, і моладзь, якая ўсмакчала ўжо новыя ідэі і новыя ідэалы аб працы, парваўшыя ўсялякую сувязь з дарэвалюцыйнай жастачковай эканомікай.

Тут, у Савецкай Баларусі, без дапамогі Масіяша, расквітае новае, нябывалае ў капіталістычных краінах, жыцьцё яўрэйскіх працоўных мас. Згінула даўнейшая, ганебная пасрэднецкая прафэсія, зьнік тып палохлівага, прыніжанага чалавека, а на яго месца зьявіўся ўпэўнены ў сваёй сіле земляроб, чалавек працы.

Гэты цуд зрабіла Кастрычнікавая рэвалюцыя, яна разбурыла ўсе прылады прыгнёту, яна правільна вырашыла нацыянальнае пытаньне ўсіх народаў, насяляючых Савецкі Саюз.

Выразныя лічбы з уступнай прамовы т. Бэйліна. Тры гады таму назад у БССР налічвалася толькі некалькі сот сем'яў яўрэяў-земляробаў, зараз у нас ёсьць больш 8000 сем'яў, якія маюць у сваім карыстаньні 53 тысячы гект. зямлі. Гэта зьяўляецца вялізарным дасягненьнем у вырашэньні нацыянальнага пытаньня, у дапамозе занапашым эканамічна народнасьцям.

Ня гэта мы бачым у нашай заходняй суседкі—Польшчы. Там усе нацменшасьці стогнуць пад страшэнным уціскам, там зьбіраюць зьезды рабінаў, каб яны заклікалі да пакорлівасьці фашысцкаму ўраду яўрэйскія масы, там ладзяць працэсы над беларускімі культурнымі дзеячамі, каб ушчэнт раздавіць, заглушыць, запужаць нацыянальнае самапачуцьцё.

У нас-жа ўрад скліканае зьезды нацменшасьцей, каб разам з імі вырашаць важныя дзяржаўныя праблемы.

Хроніка зьезду.

Адчыненьне зьезду.

Учора ўвечары ў памяшканьні БДТ адчыніўся 2-гі ўсебеларускі зьезд земляробаў-яўрэяў.

На зьезд прыбыло 170 дэлегатаў.

З уступным словам выступіў т. Бэйлін; т. Чарвякоў зрабіў даклад на тэму: «10 год існаваньня савецкай улады і далейшыя задачы».

Прывітаньні.

Зьезд учора атрымаў прывітальныя тэлеграмы ад Савету Нацыянальнасьцей ЦВК СССР і ад насельніцтва Каліндорфскага яўрэйскага райёну.

Прыезд гасьцей з суседніх рэспублік.

Для ўдзелу ў працах зьезду прыехалі прадстаўнікі: Украінскага «Озету» т. Кантаровіч і Крымскага „Озету" т. Фрыдман.

Кіно-здымкі.

Учора ў часе пасяджэньня Белдзяржкіно праводзіла кіно-здымкі зьезду.

Нядбайнасьць у хлебазагатоўках яшчэ ня зьнішчана.

Належнага пералому ў загатоўках яшчэ няма.

ПРЫВАТНІК КАРЫСТАЕЦЦА НЕПАРАДКАМ У ЗАГАТОЎКАХ І СКУПЛЯЕ БУЙНЫЯ ПАРТЫІ СЫРАВІНЫ.

У ЗАГАТОЎКАХ ХЛЕБА НА МЯСЦОХ НЯМА ПРАВІЛЬНАГА КІРАЎНІЦТВА.—МЯСЦОВЫЯ ЗАГАТОЎЦЫ САМІ ЎТВАРАЮЦЬ АЖЫЯТАЖ.—ЗАГАТОЎКІ НА МЕНСКІМ РЫНКУ ЎЗРАСТАЮЦЬ.—СПАЖЫВЕЦКАЯ КААПЭРАЦЫЯ Ў ЦІМКАВІЦКІМ РАЙЁНЕ ЎТОЙВАЕ КОЛЬКАСЬЦЬ ЗАГАТАВАНАГА ХЛЕБА.

Вінаватых шмат.

У Цімкавіцкім райёне ёсьць такія лішкі бульбы, якія ня зногуць быць скарыстаны на мясцовым рынку. Цана-ж на бульбу для загатоўкі стаіць досыць адпаведная—32-35 кап. за пуд.

Між тым мясцовая каапэрацыя, як спажывецкая, так і сельска-гаспадарчая, зусім гэтай сіравіны не загатаўляюць.

У гэты-ж час Бабруйскі акрспажсаюз у райёне Буда-Кашалёўскага і Чырвона-Бярэскага броварах вядзе загатоўку бульбы, плацячы па 50 кап. пуд і вывозячы яе ў Ленінград. Вядомая рэч, такое становішча зрывае загатоўку гэтых броваraў, і апошнім за адсутнасьцю сыравіны пагражае астаноўка, бо бульбы ўжо на месцы няма.

Нізавая спажывецкая каапэрацыя большасьці райёнаў, асабліва ў Гомельшчыне, дае павялічаныя заяўкі на завозны хлеб, не падлічваючы мясцовых патрэб. Акрсаюзы, атрымліваючы гэтыя заяўкі, без усялякага аналізу апошніх робяць мэханічна зводкі і патрабуюць ад цэнтру прывозу хлеба.

У Хойніцкім райёне, які ў Гомельшчыне лічыцца хлебным, спажывецкая каапэрацыя **да паловы сьнежня ніякай загатоўкі хлеба не вяла, а між тым пасьля нажыму за кароткі час ужо адгрузіла 4 вагоны хлебных прадуктаў.**

Маюцца недарэчнасьці і ў нашых савхозах. **Савхозы сваіх лішкаў хлеба ня здалі загатоўчым арганізацыям, а некаторыя з іх у пераапрацованым выглядзе прадавалі хлеб насельніцтву, і апошні, вядомая рэч, пападаў у рукі прыватнікаў і заможнага сялянства і толькі часткова бедняку.** Разам з тым шэраг савхозаў яшчэ не змаглі ўсяго хлеба і, відаць, чакаюць больш высокіх цэн.

На вялікі жаль, пералому ў галіне павялічэньня прывозу хлеба сялянствам яшчэ пакуль няма. Калі зараз загатоўка і павялічылася, дык гэта, галоўным чынам, за рахунак прыватніка, які, баючыся магчымага нажыму, пачаў спална рэалізаваць свае хлебныя запасы.

Можна прывесьці прыклады, што прыватнік, праз падстаўных асоб з сялян, вязе свой хлеб на продаж у загатоўчыя пункты.

У заключэньне трэба адзначыць, што Белкаапсаюз і Белсельсаюз не далі на месцы ўказаньняў аб загатоўцы другараднай экспортнай сыравіны і аб цэнах, па якіх трэба весьці загатоўкі.

Вось чаму ў Бабруйскага акрсельсаюза ляжыць на дварэ ў вялікай колькасьці загатоўленая журавіна, якая ў часе адлігі можа ўся загінуць.

Не на паперы, а на справе.

У апошні час наш друк узьняў буру аб слабасьці нашых сыравінных загатовак, аб павольным пасоўваньні нашага экспорту і яшчэ шмат аб чым. І трэба сказаць, што загатоўцы ў апошні час заварушыліся, на сыравінным рынку наглядаецца пералом, каапэрацыя ўзялася за працу, Савет Народнай Гаспадаркі пачаў выяўляць новыя віды экспорту, Белдзяржгандаль рушыў свой экспорт, але гэтага мала, мала таму, што яшчэ ёсьць шмат дэфэктаў. Калі мы прыгледзімся да тых заметак, якія зьявіліся ў друку, дык мусім сьцьвердзіць, што далёка яшчэ ня ўсё ў парадку. Загатоўцы заварушыліся, пасыпаўся мілён паперак, пасланы адносіны з цэнтру ў округу, з округі ў пункт, з пункту—агэнту і г. д.—без канца паперкі. Машыністкі не пасыпаюць пісаць.

Трэба прызнацца, што папяровая пошасьць, ня гледзячы на ўсе нашы стараньні, яшчэ да гэтага часу не зьліквідавана, нават наадварот, яна пагражае разгарнуцца ва ўсю шырыню, а між тым трэба рабіць справу, трэба рушыць яе, трэба прасякнуцца думкаю важнасьці моманту. Студзень-сакавік—самыя гарачыя, самыя важныя загатоўчыя месяцы, і не паперкі трэба рассылаць, а тварыць жывую справу—трэба загатаўляць, загатаўляць і загатаўляць.

Вопыт паказаў, што чым больш паперак, тым больш валакіты, а трэба наладзіць жывую сувязь, трэба ізьліна сачыць за загатоўкамі. Наш Наркамгандаль—ня край ён мне даруе—мае слабасьць да паперак. Паперка гуляе тры дні, праходзіць усе інстанцыі, а прыватнік ня сьпіць.

Не на паперы, а на справе—трэба сур'ёзна заявіць, што пляны павінны быць выкананы. Мы доўга вялі перапіску аб хлебазагатоўках, набралася безьліч паперак, адносін, мілёны лічбаў і плянаў, але пакуль не ўзяліся жыва за справу, нічога ня выходзіла.

Зараз пад жывым дзеланым націскам нашы хлебазагатоўкі пасунуліся наперад, адчуваецца моцны пералом у падвозе.

Шмат пісалі аб ажыятажы на пушным рынку, але пакуль не ўзяліся за справу, г. зн. пакуль не аштрафавалі — справа не наладзілася.

Да гэтага часу шчаціна паступала ў вельмі нязначнай колькасьці, з прычыны розьніцы цэн у Беларусі і іншых месцах Саюзу. Пісалі, пасылалі паперкі, а пакуль не ўзяліся за справу, пакуль Наркамгандаль БССР не санкцыяваў 5 проц. на разыходжаньне, пакуль ня былі ўстаноўлены аднолькавыя цэны, нічога ня выходзіла.

Можна было-б даць шмат прыкладаў, але ў газэце ўсяго ня зьмесьціш. Трэба толькі памятаць, што чым менш паперак, тым больш будзе справы.

Мы задыхаемся ў моры папер, трэба наладзіць жывую справу, асабліва цэнер, у разгары загатовак, і ня час займацца паперай, а трэба рабіць справу. *А. Мазін.*

Прыватнік выцесьнен з хлебнага рынку.

Цэны ў Менску зьнізіліся.

У апошні кірмашовы дзень заўважан значны падвоз збожжавых прадуктаў. Агулам было дастаўлена каля 500 цэнтнэраў усіх збожжавых культур. Узмацненьне падвозу тлумачыцца тым, што пачалі выкідаць на рынак свае хлебныя лішкі заможныя сяляне, а таксама павялічылася прапанова збожжапрадуктаў з боку прыватных млыноў.

Цэны маюць тэндэнцыю да зьніжэньня. Роля прыватніка на хлебапрадуктовым рынку зусім скарацілася. Па ранейшаму выяўляе актыўнасьць у скупцы збожжапрадуктаў мясцовы гарадзкі спажывец і бяднацкае сялянства. Інтэнсыўна купілі збожжапрадукты і дзяржаўныя хлебазагатоўцы.

У значнай колькасьці падвозіцца жыта, якога дастаўлена да 250 цэнтнэраў, і якое амаль поўнасьцю закуплена дзяржаўнымі загатоўцамі. Варта адзначыць, што прыватнік у папярэднія кірмашы скупляў значную колькасьць жыта для перапрацоўкі, а ў апошні кірмаш зусім не выяўляў попыту на жыта. Цэны, у параўнаньні з папярэднім кірмашом, зьнізіліся да 9 р. 46 к. замест ранейшых 9 р. 76 к. за цэнтнэр. Нязначны падвоз жытняй мукі простай, якая была раскуплена бядняцкім сялянствам па 10 р. 37 к. за цэнтнэр.

Аўса дастаўлена 150 цэнтнэраў. Ня гледзячы на значны падвоз, увесь час з аўсом назіраецца напружанае становішча. Выключны попыт выяўляе гарадзкі спажывец, які прапануе за цэнтнэр аўса 10 р. 68 к. Скуплялі авёс таксама дзяржаўныя загатоўцы.

Ячменю прывезена 50 цэнтнэраў. Попыт паранейшаму вялікі з боку піваварнай прамысловасьці. Прадаваўся ячмень па 10 р, 37 к. за цэнтнэр.

Пшаніцы было мала, і яна раскуплена прыватнікамі для перапродажу.

Плацілі за пшаніцу па 12 р. 20 к. за цэнтнэр.

Паранейшаму заўважаецца вострый недахват фуражу зусім няма атрубей. Вялікі попыт на вотрубі з боку сялянства. Павялічылася дастаўка на рынак сена, попыт на яго здаволен поўнасьцю. Значна павялічыўся падвоз бульбы, цэны на якую зьніжаюцца.

Прыватнік даваў пасьведчаньні на загатоўку скурсыравіны.

(Талочын, Аршаншчына).

У нас, у м. Талочыне, ёсьць працакалектыў скуранікаў, які мае свой невялічкі скураны завод. Здаецца, што-ж тут нядобрага,—беспрацоўныя атрымліваюць працу і дзякуюць уладзе.

Але гэтымі днямі высьветлілася досыць «пікантная» справа. Аказваецца, заводам кіраваў прыватнік, які ўлажыў у зваротныя сродкі працакалектыву капітал у 5000 руб.

Значыцца, атрымліваў ён пэнсію, як загадчык, а плюс да гэтага яшчэ процанты на ўложаны капітал;—адным словам, адчуваў сябе, як сыр у масьле.

Самас-ж цікавае ў тым, што гэты прыватнік-загадчык выдаваў пасьведчаньні іншым прыватнікам на загатоўку скураной сыравіны, а на пасьведчаньнях, вядомая рэч, пячатка кіраўніцкага працакалектыву пры інспэктарыяце працы.

Зараз гэта справа перададзена пракуратуры, і трэба думаць, што апошняя, каго належыць, на галоўцы не пагладзіць.

Х.

Цытаархітэктоніка мазгоў Леніна.

У часе свайго жыцьця і дзейнасьці Ўладзімір Ільліч Ленін настолькі выдзяляўся з агульнага ўзроўню чалавецтва сваім надзвычайным розумам і сваёю стальною волею, што сама сабою напрашалася натуральная ў нашыя часы думка: мазгі такога вялікага чалавека павінны розьніцца ад мазгоў іншых людзей. Дзеля гэтага пасля яго сьмерці партыяй і савецкаю ўладаю было пастаноўлена: падрэзць мазгі вялікага правадыра працоўных усебаковаму навуковаму дасьледаваньню з выкарыстаньнем усіх навейшых спосабаў і ўсіх тых ведаў, якія мае ў сваім распараджэньні сучасная навука аб пабудове мазгоў. Гэтае дасьледаваньне, наперш-ае, хоць у малой частцы павінна высьвятліць матар'яльныя падставы таго вялікага ўплыву на працоўных, якім карыстаўся Ленін, яго надзвычайнага розуму і энэргіі; павінна даць новыя падставы дзеля зразуменьня асабістасьці самаго Леніна і яго ролі ў гісторыі чалавецтва. Падругое, гэтае дасьледаваньне павінна зьявіцца каштоўным укладам у навуку аб пабудове і дзейнасьці мазгоў—гэтага найболей высокага і складанага выяўленьня жыцьця на зямлі; павінна даць далейшыя абгрунтаваньні матэрыялістычнаму сьветапогляду і такім чынам паслужыць дзеля далейшага замацаваньня справы, за якую Ленін змагаўся пры жыцьці.

Дзеля агульнага кіраўніцтва працаю на вывучэньню мазгоў Леніна быў запрошаны сусьветна-вядомы сьвяціла на анатоміі мазгоў, адзін з найболей аўтарытэтных вучоных у гэтай справе, берлінскі прафэсар Оскар Фогт, дырэктар берлінскага інстытуту па вывучэньню мазгоў. Калі блізка тры гады таму назад Наркам. Аховы Здароўя РСФСР Сямашка ездзіў на гэтаму пытаньню ўступныя перагаворы з Фогтам,—ён пастаніў апошняму справу рубам: ці спадзяецца ён мець пазытыўныя вынікі ад такога дасьледаваньня? Фогт адказаў на гэтае запытаньне ня сьцьвярджаючы, грунтуючыся як на сваёй трыццацігадовай працы па дасьледаваньню мазгоў наогул, так і на сваёй і чужой практыцы на дасьледаваньню мазгоў выдатных людзей асабліва. Пасьля гэтага ў Маскве быў падабраны дзеля дапамогі Фогту гэтар с вешкіх дасьледчыкаў, адведзена памяшканьне, закуплены неабходныя прылады і пачалася праца. Гэтая праца яшчэ далёка ад свайго заканчэньня, і гаварыць аб яе выніках яшчэ рана. Адзін толькі важны факт устаноўлены пьвёрда і названы О. Фогтам да агульнага ведама (паміж іншым, дзеля шырокае публікі ў берлінскай газэце „Берлінер Тагеблят" за 15 сьнежня 1927 г.).

Факт гэты можа быць перададзены ў адным кароткім сказе, але дзеля яго зразуменьня патрэбны тлумачэньні, патрэбен уступ да яго, а поўнасьцю зразумець і ацаніць яго можа толькі спэцыяліст на мазговай анатоміі, добра знаёмы з гэтаю справаю.

Раней паваг асьвечаныя людзі лічылі, што цела чалавека само на сабе, а яго псыхічныя пераживаньні і адчуваньні самі па сабе. Ёсьць цела і ёсьць душа, як нешта ад цела асобнае. Калі матэрыялістычны сьветапогляд у іншых навуках ужо замацаваўся цьвёрда, адносна псыхічнае дзейнасьці чалавека яшчэ вяліся спрэчкі. З боку псыхалёгаў-ідэалістаў заўжды ўказвалася на тое, што ў мазгох няма роўнаважнага надзвычайнай складанасьці псыхічных працэсаў, і што гэты роўнаважнік ніколі ня будзе знойдзены.

Псыхічнае жыцьцё зьяўляецца непарушна больш складаным і шматбаковым, чым пабудова і дзейнасьць мазгоў. У сучасны момант гэтае супярэчаньне псыхалёгаў-ідэалістаў можа ў значнай меры лічыцца адбітым.

Склад мазговае кары з многіх пластоў, сотні асобных дзялянак, дзе кожны пласт адрозьніваецца ад іншых дзялянак, многія тысячы нэрвовых каморак у кожным пласце дзялянкі—усё гэта стварае магчымасьць бясконца многіх камбінацый—ня менш розьнаякіх, чым праявы псыхічнага жыцьця.

Навука аб пабудове мазгоў за апошнія 25-30 год зрабіла вялікія посьпехі, і адным з найвыдатнейшых працаўнікоў у гэтай галіне зьяўляецца якраз О. Фогт.

Вывучэньне пабудовы мазговае кары, дзе адбываюцца іншыя вышэйшыя псыхічныя працэсы, стала прыметна пасоўвацца наперад толькі з другое палавіны мінулага стагодзьдзя. З ранейшых дасьледчыкаў можна ўспамянуць толькі Джэнэры, Бік-д-Азіра і асабліва Байяржэ (Baillarger), які ўстанавіў, што ў кары мазгоў можна адрозьніваць 6 пластоў, якія адрозьніваюцца сваімі каморкамі (велічынёю іх, формаю і колькасьцю) адны ад другіх. У 60 гадох мінулага стагодзьдзя венскі псыхіятр Майнэрт (Meynert) зазначыў, што ў розных мясцох мазгоў гэтыя пласты неаднакавы на сваёй шырыні, багацьцю каморкамі, велічыні іх і г. д., што ёсьць розьніцы ня толькі ў глыбіню кары, але таксама паміж паасобнымі ня дзялянкамі на паверхні. Майнэрт прызнаваў, што розна пабудаваныя дзялянкі кары павінны мець і розныя функцыянальнае значэньне. У гэтым сэнсе на прызнаньню праф. К. Экономо (аднаго з найбольшых знаўцаў у сучасны момант пабудовы мазгоў)—праф. Майнэрт зьяўляецца „улясьцівым закладчыкам сучаснае цытаархітэктонікі *) мазговае кары". Майнэрт адрозьніваў шасьць цытархітэктанічных палёў мазговае кары, розных па сваіх шасьці пластох. Далейшым важным крокам наперад зьявілася выйшаўшая ў 1905 г. праца ангельскага вучонага Кэмпбэла **), які надзяліў мазговую кару на 20 палёў. Праз 2 гады Элліот Сьміт ***) паказаў, што на сьвежых чалавечых мазгох нават простым вокам можна адрозьніцкаля 50 мізэархітэктанічных палёў. У наступным годзе Бродман, ****) грунтуючыся на цытаархітэктанічных адзнаках, надзяліў мазгавую кару больш як на 50 палёў. У 1925 годзе венскі праф. К. Экономо разам са сваім намоцнікам Г. Коскінасам пасьля 12 гадовай працы выпусьцілі кнігу: Die Cytoarshitektonik der Nirnrinde des erwachsenen Menschen. У гэтай кнізе яны надзялілі мазговую кару на 109 палёў (увага ў скобках: паміж іншым, кніжка гэтая каштуе 300 р. і ў Менску яе віхто ня мае). Нарэшце О. Фогт на грунце сваіх шматлікіх дасьледаў мізэархітэктанічных і цытаархітэктанічных дзеляць мазгавую кару чалавека больш, чым на 200 палёў.

Шасьць пластоў, якія ёсьць у кожным полі, адрозьніваюцца так (цытаархітэктанічна): першы панярхоўны пласт зусім без каморак, другі з многімі дробнымі зернаватымі каморкамі, трэці—з большымі і радзейшымі піраміднымі каморкамі, чацьвёрты зноў з дробнымі зернаватымі каморкамі, пяты з вялікімі (большымі, чым у 3) піраміднымі каморкамі, шосты („а" і „в") вераценазватымі каморкамі. Значэньне гэтых пластоў усё яшчэ застасецца ня зусім ясным, хоць аб гэтым напісаны горы кніжак і патрачана велізмі шмат працы дасьледчыкаў.

Пры сучасным становішчы нашых ведаў можна справу выяўляць так: чацьвёрты пласт прымае раздражэньні з глыбіні мазгоў, што ідуць (у канчатковым выніку) з нэрыфэрыі цела; каморкі пятага пласту пасылаюць раздражэньні ўглыб мазгоў (на нэрыфэрыю цела); першыя тры пласты служаць дзеля сувязі розных мэйсц кары паміж сабою, прычым у першым пласце праходзяць **валокны**, якія злучаюць розныя палі, каморкі трэцяга пласта высылаюць раздражэньні і валокны ў іншыя палі, а каморкі другога пласта прымаюць і разьмяркоўваюць. Гэтае разуменьне дзейнасьці розных пластоў устаноўлена шматлікімі дасьледамі як нармальных чалавечых мазгоў, так і мазгоў розных жывёлаў (жывёлы розьняцца па свайму розуму і дасканаласьці сваіх мазгоў), так і мазгоў розных хворых і ненармальных людзей, а таксама мазгоў чалавечых запазнакаў і дзяцей. З усяго высьнкае, што першыя тры пласты адыгрываюць важную ролю ў асацыяцыйных працэсах („думаньне" пастарому) прычым найболей актыўная роля прыпадае на долю каморак трэцяга пласта.

І вось аказ а ца, што каморкі трэцяга пласта ў мазгох Леніна ў цэлым радзе палёў мазговае кары вызначаецца сваёю асабліваю вялічынёю. Адзначаныя маланкі з мазгоў Леніна і звычайных мазгоў паказваюць гэта вельмі наглядна. Гэты факт паказвае, што асацыяцыйныя сувязі ў Леніна былі разьвіты вельмі моцна і багата. Гэтым часткова тлумачыцца той факт, што пры жыцьці Ленін вельмі хутка разьбіраўся ў самых заблытаных пытаньнях, знаходзіў сувязі і сэнс паміж такімі **зьявішчамі**, дзе іншыя людзі пінкае сувязі і сэнсу ня бачылі і потым давіліся надзвычайнай Ленінскай лёгіцы і пранікліваасьці.

Выкрышчынё асаблівасьцяй у трэцім пласьце мазговае кары мазгоў Леніна само по сабе зьяўляецца важным і каштоўным фактам, а далейшае вывучэньне, магчыма, ласьць яшчэ болейтакіх фактаў. М. С.

*) Цытаархітэктоніка—пабудова з каморак. У мазговай кары ёсьць нэрвовыя каморкі і нэрвовыя валокны, якія таксама ў розных мясцох кары ўкладаюцца парознаму. Валаконная пабудова мазговае кары называецца мізэархітэктонікаю.

**) Campbell. Histological studies on the localisation of cerebral function. Cambridge.

***) Elliott Smith. A new topographical survey of the human cerebral cortex. Journ. of Anat. a. Physiol. № 41—1907.

****) Brodmann. Beiträge zur histologischen Lokalisationslehre der grosshirnrinde. 1903-1908 in Journ f. Psychol. u. Neurol.

Недарэчнасьці ў працы па загатоўцы хлеба і сыравіны.

(На нарадзе працаўнікоў Нар. Кам. Гандлю БССР).

19 студзеня ў Нар. Кам. Гандлю адбылася памыраная нарада, на якой былі заслуханы справаздачы таварышоў, што выяжджалі ў округі для працы на ўзмацненьні хлебных і сыравінных загатовак.

Дырэктывы кіруючых органаў не даходзяць да нізоўкі.

З дакладаў высьветлілася, што ня толькі дырэктывы Нар. Кам. Гандлю, але і пастановы ўраду да месц не даходзяць. Напрыклад, аб пастанове Эканомнарады, якая была апублікавана яшчэ 31 сьнежня (пастанова аб узманеньні загатовак скурсыравіны) нават нічога ня ведалі ня толькі на раёнах, але і ў акруговым цэнтры (Магілёў).

З усіх округ ёсьць весткі, што апошнія заданьні аб загатоўках атрыман

У Прэзыдыуме ЦВК БССР.

19-га студзеня 1928 году пад старшынствам тав. А. Чарвякова адбылося чарговае пасяджэньне Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР. Разгледжан нэраг пытаньняў.

СПРАВАЗДАЧА ВЫШЭЙШАГА САВЕТУ ФІЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ АБ ЯГО ДЗЕЙНАСЬЦІ.

Старшыня Вышэйшага Савету Фізычнае Культуры БССР тав. Барсукоў зрабіў справаздачу аб дзейнасьці Вышэйшага Савету Фізычнае Культуры і становішчы фізычнага выхаваньня ў БССР.

Тав. Барсукоў у сваім дакладзе адзначыў значныя посьпехі ў справе фізычнага выхаваньня ў Беларусі з моманту вызваленьня яе ад белапалякаў. Да рэвалюцыі ў БССР існавалі розныя нацыянальна-буржуазныя спартыўныя арганізацыі, якія мелі ў сваім складзе ў большасьці дробна-буржуазную моладзь і вельмі назначную колькасьць рабочай моладзі. Пасьля вызваленьня Беларусі ад белапалякаў у 1921 годзе фізычная культура і кіраўніцтва ёю перайшла ў веданьне Усевобуча.

Усе обуч, зьяўляючыся арганізацыяй кайсовай, ня мог дастаткова ахапіць справу фізычнага выхаваньня. Пастановай Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР у лістападзе 1923 г. быў утворан пры СНК БССР Вышэйшы Савет Фізычнае Культуры. З арганізацыяй вышэйшага кіруючага органу—ВСФК пачынаецца правільнае і стройнае кіраўніцтва справай фізычнага выхаваньня працоўных Беларусі. Цыфравыя матэрыялы за апошнія 2 гады аб колькасным і якасным складзе фізычнага руху характарызуюцца наступнымі данымі:

На Беларусі ў 1926 г. налічвалася ў гарадох 226 гурткоў і па вёсцы 108 гурткоў, усяго 334 гурткі. У 1927 г. колькасьць гурткоў узрасла ў параўнаньні з 1926 г. на 423 гурткі; па колькасьці ахопленых фізкультурай: у 1926 г.—13449 чалавек, у 1927 г.—20161.

У школах ахоплена фізкультурай 65718 чал. Такім чынам па ўсёй Беларусі, акрамі пінскага і гурткоў вайсковых частак, ахоплена фізкультурай 85879 чал., з іх рабочых 37 проц. і сялян 18,5 проц.; астатняя частка падае на вучняў, дзяцей рабочых і служачых. Ва ўсіх школах-сямігодках выкладаньне фізкультуры зьяўляецца абавязковым.

Фізычная культура знайшла свой адбітак у рабоце прафсаюзаў, галоўным чынам, праз арганізацыю гурткоў фізкультуры пры клюбах альбо прадпрыёмствах. Камсамол зьяўляецца асноўнай базай, сярод якіх праводзіцца фізкультура, у сувязі з чым камсамолу належыць практычнае кіраўніцтва работаю саветаў фізкультуры. Пытаньне ваенізацыі фізкультуры займае ў сучасны момант вялікую ўвагу саветаў фізкультуры. Праводзіцца цэлы шэраг адпаведных мерапрыёмстваў.

Па дакладу Вышэйшага Савету Фізкультуры ў спрачках выказаліся т. т. Хацкевіч, Яцкевіч, Ігнатоўскі, Леў і Сташэўскі.

Тав. Хацкевіч адзначае значныя дасягненьні ў разьвіцьці фізычнай культуры і тую вялікую ўвагу, якую зварочвае гэтай справе ЦВК Саюзу ССР і ЦВК Саюзных Рэспублік. Але ёсьць яшчэ шмат дэфэктаў: мясцовыя органы фізкультуры слаба зьвязаны з адпаведнымі выканкомамі і саветамі. У зьвязку з вялікім значэньнем фіз культуры ў справе фізычнага выхаваньня моладзі, трэба разьвіць савецкую грамадзкасьць навакол гэтага пытаньня. Гарадзкія саветы ў асаблівасьці, і наогул выканкомы, павінны больш зацікавіцца справай фізкультуры.

Тав. Яцкевіч указвае на малы ахоп фізкультурай вёскі. Горад павінен даваць прыклад вёсцы; у Менску, як сталіцы Беларусі, трэба пабудаваць цэнтральны спортстадыён і цэнтральны дом фізкультуры.

Тав. Ігнатоўскі ўказвае масаванасьць савецкай фізкультуры. Мала зварочваецца ўвагі на фізычнае выхаваньне моладзі з боку Наркамасьветы.

Тав. Сташэўскі лічыць неабходным больш увязаць фізкультуру з васпізацыяй.

Прэзыдыум ЦВК пастанавіў работу Вышэйшага Савету Фізычнай Культуры лічыць здавальняючай і адзначыць значныя посьпехі ў разьвіцьці фізычнай культуры ў Беларусі, ня гледзячы на тое, што гэта работа праходзіла ў надзвычайна цяжкіх умовах. Для распрацоўкі праекту пастановы па дакладу выдзелена камісія ў складзе: т. т. Яцкевіча, Сташэўскага, Барсукова, Баліцкага, Файнбурга, Крэмер і Раа.

АБ РОСПУСКУ ВЫБАРЧЫХ КАМІСІЙ.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, у зьвязку з перанясеньнем перавыбараў саветаў на восень 1928 году, пастанавіў распусьціць створаныя акруговыя, раённыя, гарадзкія, местачковыя і сельскія выбарчыя камісіі.

АБ УЗМАЦНЕНЬНІ БАРАЦЬБЫ З САМАГОНАКУРЭНЬНЕМ.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, у сувязі з хлебазагатоўчай кампаніяй, зацьвердзіў абежнік на імя ўсіх акруговых і раённых выканаўчых камітэтаў аб узмацненьні барацьбы з самагонакурэньнем. Гэты абежнік рассылаецца ў тэрміновым парадку на месцы.

АБ ЗАБАРОНЕ БРАНЬНЯ ПРОЦАНТАЎ ЗА ПАЗЫЧКІ ЗВЫШ РАЗЬМЕРАЎ, УСТАНОЎЛЕНЫХ СНК БССР.

Прэзыдыум ЦВК зацьвердзіў унесены СНК БССР праект пастановы ЦВК і СНК БССР аб зьмене артыкулу 193 Крымінальнага Кодэксу. Згодна гэтай пастановы, браньне процантаў за пазычкі звыш разьмераў, устаноўленых СНК БССР, а таксама браньне за пазычаныя прылады вырабу, жывёлы, палёвае і гароднае насеньне платы, якая значна перавышае звычайную для данае мясцовасьці нормы, выклікае пазбаўленьне волі бяз строгае ізаляцыі на тэрмін да аднаго году, а ў некаторых выпадках да 3-х год.

У Савеце Нар. Камісараў БССР

14, 15 і 16 студзеня г. г. адбывалася пасяджэньне Савету Народных Камісараў. У гэтым пасяджэньні прымалі ўдзел старшыні ўсіх акруговых выканаўчых камітэтаў і адказныя працаўнікі округ па фінансавых пытаньнях. На гэтым пасяджэньні разглядаліся пытаньні: аб зводзе мясцовага бюджэту і аб самаабкладаньні насельніцтва. Для збалянсаваньня зводу мясцовых бюджэтаў і для апрацоўкі разьлюцыі па пытаньні аб мясцовым бюджэце складзена Камісія, падрабязная інфармацыя аб гэтым будзе дадзена ў наступны раз.

(Пасяджэньне 19 студзеня г.г.).

САЦЫЯЛЬНАЕ СТРАХАВАНЬНЕ НА 1927-28 ГОД.

Савет Народных Камісараў заслухаў даклад Нач. Галоўсацстраху пры НК Працы БССР—т. Алесіна і разглядзеў унесены Дзяржплянам план і бюджэт сацыяльнага страхаваньня на 1927 28г.

Савет Народных Камісараў адзначыў, што нараўне з ростам даходаў органаў сацыяльнага страхаваньня ёсьць значны рост забясьпечваемых пры пастаянным павялічэньні ўсіх відаў пэнсій і дапамог: па інвалідасьці з 10.244 да 12.116 чалавек, па беспрацоўі з 12.341 да 14.841 чал., сярэдні разьмер пэнсій інвалідам з 15 р. 96 к. да 16 р. 35 к., сярэдні разьмер дапамог па беспрацоўі з 10 р. 90 к. да 11 р. 37 к. Адначасна з гэтым СНК адзначыў, што беспрарыўнае зьніжэньне страхавога тарыфу і значная запазычанасьць гаспадарчых органаў па сацыяльным страхаваньні затрымлівае рост прыбытку, з прычыны чаго фінансавае становішча сацыяльнага страхаваньня напружанае і выклікае перабоі ў рабоце органаў сацыяльнага страхаваньня.

Савет Народных Камісараў зацьвердзіў плян сацыяльнага страхаваньня на 1927-28 г. у наступным відзе: 1) забесьпячэньне па часовай непрацаздольнасьці на 100 застрахаваных—900 дзён у годзе; 2) забесьпячэньне па інвалідасьці 7.946 чал. інвалідаў і 3.170 чал. членаў іх сямей, а ўсяго 12.116 чал. на пэнсіі і 100 чал. у інвалідным доме; 3) забесьпячэньне на беспрацоўі 14.841 чал. на дапамозе, а таксама працоўная дапамога па плянах барацьбы з беспрацоўем; 4) па дадатковых відах дапамогі на 100 чал.—выдач на ўход за народжанымі для застрахаваных 11,5, для пэнсіянэраў—1,3, для беспрацоўных—7,1; на карміленьне (месяцы) для застрахаваных—102,1, для пэнсіянэраў—12,2, для беспрацоўных—51,8; на пахаваньне—3,8; 6,1 і 2,5; 5) прафілактычная дапамога: зімовыя дамы адпачынку—180 коек на 5 месяцаў, летнія дамы адпачынку 810 коек на 5 мес., сканчэньне пабудоўкі зімовага дому адпачынку ў Ждановічах на 200 коек, сканчэньне пабудоўкі тубэркулёзнага санаторыя «Сасноўка» на 150 коек (Віцебск. акр.), 243 курортныя месцы і 6) страхавая асьвета—гурткі, лекцыі і інш.

НКАховы Здароўя запрапанавана прыняць у 1927-28 г. на сродкі фонду мэдыцынскай дапамогі застрахаваным: утрыманьне 80 коек з агульнага ліку коек у зімовых дамох адпачынку ў суме 36 тыс. руб., утрыманьне 100 коек у санаторыі «Сасноўка» ў суме 99 тыс. руб., утрыманьне доктарска-кантрольных камісій і доктарскіх кансультацый у суме 80 тыс. руб. Апрача гэтага, НК Аховы Здароўя перадае галоўсацстраху 95 тыс. руб. у лік кампэнсацыі за перадаваемыя яму памяшканьні Цэнтральнага Дому Адпачынку ў Менску.

У адпаведнасьці з плянам і ўнесенымі ў яго зьменамі бюджэт сацыяльнага страхаваньня на 1927-28 г. прыняты ў наступнай суме: па даходах—10.398 тыс. руб., дэфіцыт у 122 тыс. руб., а ўсяго ў 10.520 тыс. руб.; па выдатках—10.520 тыс. руб.

З мэтаю ўзмацненьня фінансавых органаў сацыяльнага страхаваньня СНК прызнаў патрэбным устанавіць строгую бюджэтную дысцыпліну ў страхавых органах і запрапанаваў НКФ і гаспадарчым органам зьвярнуць увагу на недапушчальнасьць затрыманьня ўплаты страхавых узносаў, а таксама прызнаў патрэбным узьняць перад СНК СССР хадайніцтва аб адпуску завінавачанасьці Цустраха па пабудоўцы санаторыя „Сасноўка“ ў суме 485 тыс. руб., а таксама аб пакрыцьці дэфіцыта ў разьмеры 122 тыс. руб. з сродкаў Цустраха.

З мэтаю палепшаньня абслугоўваньня застрахаваных Галоўсацстраху запрапанавана паленьшыць пастаноўку справы дачы адпуску застрахаваным па хваробе, спросьціць парадак атрыманьня застрахаванымі пэнсій і дапамог праз скарачэньне да мінімуму ліку справак і дакумантаў, якія патрабуюцца на права атрыманьня пэнсій і дапамог, праз арганізацыю выплатных пунктаў у рабочых раёнах, на прадпрыёмствах і г. д. З мэтаю далейшага пашырэньня сацыяльнага страхаваньня сярод працоўных Галоўсацстраху запрапанавана пераглядзець існуючае палажэньне аб страхаваньні рабочых па вёсцы (батракоў), узьняць перад Цустрахам пытаньне аб устанаўленьні забесьпячэньня пэнсій састарыўшых рабочых больш 60 год.

НК Аховы Здароўя і Галоўсацстраху разам з Інбелкультам запрапанавана распрацаваць пытаньне аб магчымасьці разьвіцьця мясцовае курортнае справы.

АБ ХОДЗЕ ЗАГАТОВАК СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ СЫРЫЗНЫ І АБ ЭКСПОРЦЕ.

На гэтым пасяджэньні Савет Народных Камісараў выслухаў даклад Народнага Камісара Гандлю БССР т. Адамайціса аб ходзе загатовак сельска-гаспадарчай сырызны і аб экспорце.

Падрабязная інфармацыя аб прынятых Саветам Народных Камісараў мерапрыёмствах у галіне загатовак будзе дадзена ў заўтрашнім нумары.

Мазырскі Акруговы Зямельны Аддзел абвяшчае,
што 8 лютага 1928 г. у памяшканьні Акрза (вул. Розы Люксэмбург, № 43) адбудуцца

ВУСНЫЯ ТАРГІ

НА ПАСТАЎКУ ХАРЧОЎ (хлеба, сала, мяса, крупы і г. д.)
для рабочых на мэлярыцыйных работах у летні час 1928 году ў Лельчыцкім, Тураўскім і Жыткавіцкім раёнах, Мазырскай округі.

Агульная пастаўка да 15.000 рублёў.

Пастаўка магчыма і па адным і на чатырох дагаворах на суму на кожным ня звыш 6000 рублёў. З умовамі пастаўкі жадаючыя маюць магчымасьць штодзённа азнаёміцца ў Акрзэмаддзеле.

Да таргоў дапушчаюцца дзяржаўныя, каапэратыўныя, грамадзкія арганізацыі, а таксама і прыватныя асобы, пры ўносе імі 10 проц. залогу.

АКРЗЭМАДДЗЕЛ.

Тэлеграмка № 392.

ЦЫРКУЛЯРНА.

Пасьпяховая рэалізацыя пазыкі ўзьніме дабрабыт працоўнага сялянства.

Усім акрвыканкомам.

30-га сьнежня 1927 г. Прэзыдыумам ЦВК Саюзу ССР зацьверджана пастанова аб выпуску дзяржаўнае выйгрышнае ўнутранае пазыкі ўзмацненьня сельскае гаспадаркі. Значэньне гэтае пазыкі далёка ня вычэрпваецца яе фінансавымі вынікамі. Пасьпешнае разьмяшчэньне пазыкі неабходна для ажыцьцяўленьня асноўнай палітычнай лініі савецкай улады і будзе мець агромністае значэньне ў справе барацьбы з тымі гаспадарчымі цяжкасьцямі, якія неабходна перамагчы ў сучасны момант.

Пасьпешная рэалізацыя пазыкі ўзмацненьня сельскае гаспадаркі магчыма толькі пры ўновах напружанай працы ўсёй савецкай грамадзкасьці і пры правядзеньні шырокае агітацыйнае кампаніі, разьлічанай на сапраўдны ахват усяго многамілённага сялянства.

У зьвязку з гэтым Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР прапануе прыняць да тэрміновага выкананьня наступнае:

1. Точна і поўна інфармаваць старшынь раённых выканаўчых камітэтаў аб тэй працы, якую ім належыць правесьці, маючы на ўвазе тое, што асноўная работа праводзіцца па раёнах.

2. Для забесьпячэньня больш пасьпяховага правядзеньня кампаніі практыкаваць камандыроўкі ў раёны спэцыяльных упаўнаважаных для кіраўніцтва работай раённых выканаўчых камітэтаў. Неабходны для камандыровак кадр работнікаў выдзеліць з ліку штатных супрацоўнікаў фінансавых і крэдытных устаноў, а ў выпадку неабходнасьці і са складу супрацоўнікаў іншых дзяржаўных устаноў і каапэратыўных арганізацый.

3. Аказаць максымальнае садзейнічаньне фінансавым органам у справе правядзеньня кампаніі, якая ўжо пачалася і павінна скончыцца да 1 красавіка г. г.

4. Прыняць усе меры да мабілізацыі вакол пытаньня аб пазыцы грамадзкай думкі шляхам пастаноўкі адпаведных пытаньняў на пленумах, нарадах, розных канфэрэнцыях і г. д. і сыстэматычнага высьвятленьня гэтых пытаньняў у друку.

5. Для непасрэднага правядзеньня кампаніі па акрузе арганізаваць акруговыя камісіі з прадстаўнікоў: акрвыканкому, акруткому, акрпрафбюро, акрфа і акрзэмаддзелу пад старшынствам старшыні акрвыканкому.

6. Для правядзеньня кампаніі па паасобных раёнах арганізаваць у кожным раёне раённыя камісіі з прадстаўнікоў: райвыканкому, райкому і райфінчасьці, пад старшынствам старшыні райвыканкому.

7. Правядзеньне кампаніі па рэалізацыі пазыкі ў сельскіх мясцовасьцях ускласьці на сельскія саветы.

8. Арганізаваць вылучэньне ў кожнай залюднанай мясцовасьці спэцыяльных упаўнаважаных па рэалізацыі пазыкі.

9. Заслухоўваць на сваіх пасяджэньнях даклады акруговай камісіі і райвыканкомаў аб ходзе кампаніі і прымаць усе меры да таго, каб кантрольныя лічбы, вызначаныя акрузе і раёнам, былі поўнасьцю рэалізаваны, памятуючы пры гэтым, што рэалізацыя навінна праходзіць выключна ў дабраахвотным парадку.

10. Аб прымаемых мерах і аб ходзе кампаніі рэалізацыі пазыкі пэрыядычна паведамляць Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту кожныя два тыдні.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

19 студзеня 1928 г.
г. Менск.

Хроніка.

У Нар. Кам. Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі.

РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ МАТАР'ЯЛЬНАЙ ЧАСЬЦІ МБЕ І ЗАХОДНІХ ЧЫГУНАК.

Абсьледаваньне матар'яльнай часьці МБЕ і Зах. чыгунак выявіла, што гэтыя часьці пастаўлены ня зусім добра ў сэнсе больш хуткай і беспераробнай дастаўкі матар'ялаў для чыгуначнага будаўніцтва.

У некаторых складах чыгунак загатоўлена матар'ялаў аж на 10 год. Гэта бесгармальна, бо матар'ялы заграмаджаюць склады, дый загатаўляць іх на 10 год няма ніякай патрэбы.

Калегія НК РСІ дала поўны шэраг канкрэтных указаньняў да рацыяналізацыі матар'яльнай часьці чыгунак у бок непасрэднага прыстасаваньня да будаўніцтва. Таксама дадзены ўказаньні аб перагляндзе на некаторых складах штатаў у сэнсе іх большай нагрузкі.

СПРАВА ГОМЕЛЬСКАГА «ПОЛЕСТОРГА».

Калегія НК РСІ па матар'ялах абсьледаваньня „Палесторга“ ўстанавіла, што з боку працаўнікоў яго ў часе ліквідацыі Гомельскай губерні і далучэньня яе да БССР было дапушчана шмат злачынстваў у камандыроўках па справе ліквідацыі „Полесторга“. Таксама дапушчаны і іншыя непатрэбныя выдаткі грошай.

Калегія пастанавіла перадаць гэту справу пракуратуры для прыцягненьня вінаватых да судовай адказнасьці.

НЕПАРАДКІ Ў СЛУЦКІМ «ХЛЕБАПРАДУКЦЕ».

У часе перадачы спраў б. загадчыкам цукровага аддзяленьня Слуцкага „Хлебапрадукту“ Гулецкім быў выяўлен недахват 826 кілё цукру на суму 546 руб. Гэтую суму Гулецкі зараз-жа заплаціў. Пасьля гэтага здароньня органы «Хлебапрадукту» і інш. арганізацыі зрабілі расьсьледаваньне гэтай справы. У выніку былі складзены два розныя акты. Зразумела, што тут ці Гулецкага свае супрацоўнікі „околачылі, ці сам Гулецкі вінават, ці ў „Хлебапрадукце“ няма парадку.

Калегія НК РСІ пастанавіла камандыраваць у Слуцак інспэктара ці спэца-экспэрта для тэрміновага расьсьледаваньня гэтай справы разам з зацікаўленымі ўстановамі.

Праверка беларусізацыі ў БДУ.

Праўленьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту выдзеліла камісію для праверкі правядзеньня беларусізацыі на асобных факультэтах БДУ. Праверка ўжо распачалася. Уся гэта праца павінна быць закончана да 1-га сакавіка.

У т-ве «Прэч няпісьменнасьць».

Менскі акруговы савет т-ва „Н. П.“ на сваім пасяджэньні ад 19-1 пастанавіў дзеля ажыўленьня працы раённых канфэрэнцый т-ва „НП“, якія зараз пачнуцца, абслугоўваць іх сябрамі прэзыдыуму акрсавета, а таксама ў пачатку лютага абгледзіць працу лучэек „НП“ Логойскага, Пухавіцкага, Сьмізаўскага і Астрашыцка-Гарадзецкага райёнаў.

Абсьледаваньне працы клюбаў гор. Менску.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў у працягу месяца з 20 студзеня да 20-га лютага зрабіць абгляд масавай і культурна-асьветнай працы ўсіх клюбаў Менску.

Кампанія будзе весьціся ў напрамку высьвятленьня пытаньняў клюбнай працы ў мясцовым друку.

У першую чаргу будуць абсьледаваны наступныя клюбы гор. Менску: саагандальслужачых, Дом Асьветы, клюб будаўнічых і клюб імя Леніна Зах. чыгункі.

Школы сялянскай моладзі ў БССР.

У БССР зараз існуе 14 школ сялянскай моладзі.

У гэтых школах навучаецца 919 чал., з якіх хлапцоў—751 і дзяўчат—168. На утрыманьне гэтых школ у мінулым годзе было адпушчана—193223 руб.

3000 чал. прайшло праз Цэнтральны Дом Селяніна.

За апошнія 3 месяцы праз абшчажыцьцё Цэнтральнага Дому Селяніна прайшло каля 3000 сялян.

Сялянам даюцца агранамічныя, юрыдычныя і судовыя парады, а таксама чытаюцца лекцыі і даклады па сельска-гаспадарчай асьвеце.

Новая кансультацыя для цяжарных.

У бягучым годзе Нар. Кам. Аховы Здароўя БССР адчыніла новую кансультацыю для цяжарных у Віцебску. Апроч гэтага адпушчаны сродкі для ўвядзеньня дадатковых прыёмаў у Аршанскай і Магілеўскай кансультацыях для цяжарных.

Абсталяваньне для клінікі па нэрвовых хваробах.

Наркамздраў асигнаваў 2.000 руб. на закупку абсталяваньня для Менскай клінікі па нэрвовых хваробах. Пачалі ўжо паступаць розныя машыны, паміж іншым атрыманы машыны для дасьледваньня разумовых здольнасьцяў.

2938 руб. на дапамогу палітзьняволеным.

Гэтымі днямі накіравана ў Маскву 2938 руб., якія сабраны за апошнія часы ў БССР, на дапамогу палітзьняволеным у буржуазных краінах.

Рост пайшчыкаў МЦРК.

За апошні час прыкмячаецца ўзмоцнены рост пайшчыкаў Менскага Цэрабкому, штодня ў сярэдзіне прыбывае па 30 чал.

За сьнежань паступіла 623 новыя пайшчыкі.

12 вагонаў шкла для БССР.

Устаноўлен плян завозу ў БССР наўбелага ваконнага шкла на люты.

Згодна пляну, у лютым у БССР будзе завезена 12 вагонаў гэтага шкла.

Капітальнае будаўніцтва ў тарфянай прамысловасьці.

Зацьверджан плян капітальнага будаўніцтва у тарфянай прамысловасьці. Згодна гэтага пляну, у 1927-28 апэрацыйным годзе на капітальнае будаўніцтва ў тарфянай прамысловасьці асигнавана 376000 р.

Ажыўленьне мясцовай прамысловасьці.

У апошні час прыкмячаецца значнае ажыўленьне мясцовай прамысловасьці. Акрвыканкомы зрабілі шмат заказаў праз Управу Дзяржгандлю БССР на рознае абсталяваньне. З больш буйных заказаў трэба адзначыць наступныя: Полацкі акрвыканком заказаў абсталяваньне для цагельнага заводу, Магілеўскі—на абсталяваньне для чыгунна-ліцейнага заводу, Аршанскі—для Якаўлевіцкай суконнай фабрыкі. Акрамя гэтага, Менскі Эльвод зрабіў заказ на насосы для водаправоду.

50 тысяч руб. крэдыту касам узаемадапамогі.

Белкамунбанк адпусьціў 50 тыс. руб. на крэдытаваньне прафсаюзных кас узаемадапамогі, якія будуць весьці крэдытныя апэрацыі.

Сродкі гэтыя будуць разьмяркованы ЦСПСБ паміж касамі ўзаемадапамогі прафарганізацый Менскай, Віцебскай і Гомельскай округі.

Рознае.

З ПУСТЫНІ—ЛАДАРОДНАЯ ВОБЛАСЬЦЬ.

Вучоны Бол устанавіў, што ў цэнтральнай частцы Эгіпту ёсьць аграмадная ўпадзіна ніжэй за ўзровень мора. Калі гэту ўпадзіну зьвязаць каналам з Сярэдземным морам, дык у ёй будзе штучнае возера. Гэта возера можа зьмяніць клімат Эгіпту і перарабіць пустыню ў ладародную вобласьць.

ЧЫРВОНЫ СЬНЕГ.

У канцы сьнежня ў Калумбіі (Паўдзённыя Амэрыка) выпаў у гарах чырвоны сьнег. Вучоныя ўстанавілі, што сьнег чырвоны ад маленькіх пылінак асаблівай расьліны чырвонага колеру. Панесла іх угару навальніца.

ШТУЧНАЕ АХАЛАДЖВАНЬНЕ ПАВЕТРА.

У амэрыканскім горадзе Тэхасе, які знаходзіцца ў гарачым клімаце, абсталёвана спэцыяльнае ахаладжваньне. Па сетцы труб цэнтральная станцыя дастаўляе ў кватэры астуджанае паветра, якое заміняе для жыхарства лядоўні.

У РАБОЧЫХ КВАРТАЛАХ ПАРЫЖУ ТОПЯЦЦА КОНІ.

У адным з рабочых кварталаў Парыжу, на вуліцы Шэрфой, у балоце ўтаніўся конь. З нагоды гэтага французкая газэта „Юманіта“ паведамляе, што ў гэтым самым месцы летась утанілася дзіцяпё.

ЗА 11 ГАДОЎ КАТАРГІ—400 РУБЛЁЎ.

Французкі рабочы Бэльлён, які адбыў на катарзе 11 гадоў, зараз выкінуты з прычыны выяўленай судовай памылкі. Бэльлён атрымаў ад ураду ўзнагароду... у 400 рублёў.

Апавяшчэньні.

— Сёньня, 21 студзеня, а 7 гадзіне ўвечары ў залі Інбелкульту адбудзецца аб'яднаны агульны сход членаў мясцкомаў Інбелкульту і Цэнтраархіву, Нарыкамасьветы і Навукова-Дасьледчага Інстытуту імя Леніна.

ПАВЕСТКА:

1. Ленін і пралетарская культура — дакладчык тав. Ігнатоўскі.
2. Справаздача МЦРК.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 21 студзеня, адбудзецца вечар, прысьвечаны 4-й гадавіне з дня сьмерці Леніна.

Спэцыяльная праграма канцэрту.

Пачатак роўна а 7-й гадзіне ўвечары.

Уваход толькі па білетах, распаўсюджаных па групкомах і мясцкомах.

— У нядзелю, 22-га студзеня, а 7-й гадзіне адбудзецца лекцыя дацэнта БДУ т. Тэніна на тэму «Мастацтва, кіно і школа». Уваход для ўсіх членаў саюзу вольны.

ПЭДГАБІНЭТ.

У пачадзелак, 23-1, а 7 гадз. увечары—пашыранае пасяджэньне мэтадычнай камісіі з удзелам школьных санітарных дактароў і загадчыкаў сямігадовых школ. У парадку дня даклад т. Пісарчыка аб школьнай мэблі.

ПРАДАЕЦЦА
зрыў-папера, макулатура і старыя газэты.
Спытацца ў канторы газэты **„Савецкая Беларусь“**
(Рог вуліц Карла Маркса і Ленінскай, 2-гі дом Саветаў).

Цэнтральны Камітэт Беларускага Т-ва Чырвонага Крыжу

ў панядзелак, 23 студзеня, у Доме Культуры наладжвае

ВЯЛІКІ ВЕЧАР

на карысьць дзяцей бяднейшых рабочых і сялян Заходняй Беларусі.

ПРАГРАМА:

1. **Кіно-сэанс**—абразкі з беларускіх фільм.
2. **Паказ БДТ 2**—„Чорт і баба“, жарт у 1 дзеі.
3. **Выступленьне паэтаў: Янкі Купалы, Якуба Коласа, Гартнага, Міхася Чарота.** Творы прысьвечаныя Зах. Беларусі.
4. **Канцэртная частка.**
5. **Студыйны хор** пад кір. **А. Ягорава.**

ЛЁТАРЭЯ-АЛЕГРЫ, арганізаваная Дзіцячай Камісіяй пры ЦВК БССР сумесна з ЛКСМБ.

ГУЛЬНІ. КІЁСКІ. БУФЭТ.

Пачатак а 8 з'палов. гадз. вечара.

Цэны білетаў ад 50 кап. да 5 руб

Папярэдні продаж білетаў у ЦК Чырв. Крыжу (вул. К. Маркса, № 3, тэл. 105), Інбелкульце (Ровалюцыйная вул, № 21), магазыне Дзіцячай Камісіі (Савецкая № 90) і ў касе „Культуры“.

Пры ўваходзе абавязкова здымаць верхнюю вопратку.

ДА ВЕДАМА ІНШАГАРОДНІХ ПАДПІСЧЫКАЎ!
Кантора газэты „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ“
просіць усіх іншагародніх падпісчыкаў, што падпісаліся на газэту, пачынаючы з кастрычніка 1927 году, на 3 месяцы і больш, яны належыць атрымаць
ПРЭМІЮ
КНІЖНІ КАСЫ АШЧАДНАСЬЦІ,
з першым узносам ад рэдакцыі; зазначуцца для атрыманьня іх
У БЛІЖЭЙШУЮ АД МЕСЦА ЖЫЦЬЦЯ КАСУ АШЧАДНАСЬЦІ.

Да ведама нашых чытачоў.

У брашуры „Сыстэма народнай асьветы БССР“, якая разаслана гэтымі днямі нашым падпісчыкам, даклады тав. Баліцкага і Раппо зьмешчаны поўнасьцю. Прамовы-ж таварышоў, выступаўшых у парадку спрэчак, зьмешчаны ў скарочаным выглядзе.

РЭДАКЦЫЯ.

ЗАКОНЫ і ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

аб адкліканьні выбаршчыкамі з саветаў выбраных імі дэпутатаў.

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускае ССР пастанаўляе:

1. Устанавіць наступныя прычыны і парадак адкліканьня выбаршчыкамі з саветаў выбраных імі дэпутатаў:

1. Выбаршчыкі могуць адклікаць з саветаў выбраных імі дэпутатаў пры наяўнасьці адной з наступных прычын:

а) невыпаўненьне наказу выбаршчыкаў;

б) адмова ад выпаўненьня даручэньняў савету;

в) сыстэматычнае непаведваньне пасяджэньняў савету;

г) ведапушчальнае для члена савету паводзіньне.

2. Пытаньне аб адкліканьні з савету дэпутата можа быць узьнята: выбаршчыкамі ў колькасьці ня менш адной трэці выбаршчыкаў данага выбарчага участку; прафэсыянальнымі арганізацыямі; камітэтамі сялянскіх таварыстваў узаемазапамогі і іншымі грамадзкімі арганізацыямі; дэлегацкімі сходамі жанчын, а таксама гарадзкімі, местачковымі і сельскімі саветамі.

3. Заявы аб адкліканьні дэпутата ў савету, з паказаньнем прычын адкліканьня, падаюцца ў адпаведны савет, апрача тых выпадкаў, калі гэта пытаньне ўзьнята непасрэдна саветам.

4. Гарадзкі, местачковы, або сельскі савет, абгаварыўшы пытаньне аб адкліканьні дэпутата з савету, выносіць пастанову аб адкліканьні на паўны дзень сходу выбаршчыкаў адпаведнага выбарчага вучастку. Пры гэтым савет абавязан аб прынятай ім пастанове паведаміць адкліканага дэпутата і запрасіць яго на сход выбаршчыкаў.

5. Для правамоцнасьці сходу выбаршчыкаў выраішць пытаньне аб адкліканьні дэпутата з савету неабходна прысутнасьць ня менш 35 проц. выбаршчыкаў данага выбарчага вучастку ў сельскіх мясцовасьцях і мястэчках і ня менш 50 проц. у гарадох.

6. Пытаньне аб адкліканьні дэпутата вырашаецца простаю большасьцю галасоў прысутных на сходзе выбаршчыкаў.

7. Па адкліканьні дэпутата яго месца ў савеце займае кандыдат у члены савету ў парадку большасьці галасоў на кандыдацкім сьпіску. У выпадку адсутнасьці па якіх-небудзь прычынах кандыдата ў члены савету ад данага выбарчага вучастку, гэты-ж сход мае права выбраць новага дэпутата ў савет і кандыдата да яго.

II. Даручыць Савету Народных Камісараў паводле гэтае пастановы распрацаваць праекты зьмен і палажэньняў аб сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветах.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Сэкратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Хацкевіч.**

30 сьнежня 1927 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Президиума ЦИК Белорусской ССР

об отзыве избирателями из советов избранных ими депутатов.

Президиум Центрального Исполнительного Комитета Белорусской ССР постановляет:

1. Установить следующие причины и порядок отзыва избирателями из советов избранных ими депутатов:

1) Избиратели могут отзывать из советов избранных ими депутатов при наличии одной из следующих причин:

а) невыполнение наказа избирателей;

б) отказ от выполнения поручений совета;

в) систематическое непосещение заседаний совета;

г) недопустимое для члена совета поведение.

2. Вопрос об отзыве из совета депутатов может быть поднят: избирателями в количестве не менее одной трети данного избирательного участка; профессиональными организациями, комитетами крестьянских обществ взаимопомощи и другими общественными организациями; делегатскими собраниями женщин, а также городскими, местечковыми и сельскими советами.

3. Заявления об отзыве депутатов из советов, с указанием причин отзыва, подаются в соответствующий совет, за исключением тех случаев, когда этот вопрос поднят непосредственно советом.

4. Городской, местечковый или сельский совет, обсудив вопрос об отзыве депутата из совета, выносит постановление о созыве в определенный день собрания избирателей соответствующего избирательного участка. При этом совет обязан о принятом им постановлении известить отзываемого депутата и пригласить его на собрание избирателей.

5. Для правомочности собрания избирателей разрешить вопрос об отзыве депутата из совета, необходимо присутствие на собрании не менее 35 проц. избирателей данного избирательного участка в сельских местностях и местечках и не менее 50 пр. в городах.

6. Вопрос об отзыве депутата разрешается простым большинством голосов присутствующих на собрании избирателей.

7. При отзыве депутата его место в совете занимает кандидат в члены совета в порядке большинства голосов по кандидатскому списку. В случае отсутствия по каким нибудь причинам кандидата в члены совета от данного избирательного участка, этое же собрание правомочно избрать нового депутата в совет и кандидата к нему.

II. Поручить Совету Народных Комиссаров на основании настоящего постановления разработать проекты изменений в Положениях о сельских, местечковых и городских советах.

Председатель Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Червяков.**

Секретарь Центрального Исполнительного Комитета БССР **А. Хацкевич.**

30 декабря 1927 г.
гор. Минск.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

АБАВЯЗКО